ПРОЗА

## Зіновій Прыгодзіч

# ЧАРОМХАВЫЯ БАЛАДЫ

Аповесць



*Зіновій Кірылавіч Прыгодзіч* нарадзіўся 15 кастрычніка 1944 года ў вёсцы Лышча Пінскага раёна. Пасля заканчэння аддзялення журналістыкі Белдзяржуніверсітэта працаваў у газеце «Звязда», у ЦК КПБ, галоўным рэдактарам газеты «Советская Белоруссия», першым намеснікам старшыні Дзяржкамдруку Рэспублікі Беларусь. Цяпер — галоўны рэдактар часопіса «Гаспадыня».

Друкавацца пачаў у 1957 годзе. Аўтар кніг прозы «Журба мая светлая» (2002), «Крымская сімфонія» (2005), «Путь полной луны» (2009), «Родник у лесных берез» (2011), «Постаці» (2011) і інш., а таксама зборніка вершаў «Калі б не ты» (2002).

Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі (2017).

Алесь Пятровіч, былы супрацоўнік рэспубліканскай газеты, а цяпер пенсіянер, глядзеў па тэлевізары вячэрні выпуск апошніх навін, калі нечакана пазваніў унук Міколка.

— Дзядуля, можна я да цябе на хвілінку завітаю?

— Канешне, можна. Чаго ты яшчэ пытаешся?

— Ну, ці мала што. Раптам ты нечым пільным займаешся...

— Давай прыходзь.Чакаю.

Міколка — старэйшы ўнук Алеся Пятровіча. І, бадай, самы любімы. Не, ён любіў і сваіх унучак — Алёну і Кацю, але то былі дзяўчаткі, і з імі ў дзеда, вядома ж, было куды менш агульных інтарэсаў. А з Міколкам ён з самага яго дзяцінства гуляў у розныя гульні, у школе памагаў пісаць сачыненні, а калі той вучыўся ва ўніверсітэце — падсабляў матэрыяльна. Але дзеда з унукам збліжала не толькі гэта. У іх была еднасць больш высокая — духоўная. Алесь Пятровіч прывучаў Міколку да сур'ёзнай літаратуры, заахвочваў яго, тэхнара, праграміста, да размоў, а часам і даволі эмацыянальных дыскусій пра важныя жыццёвыя праблемы, далікатна, неназойліва накіроўваў яго маральна-духоўнае станаўленне. З гадамі ў іх склаліся цёплыя, даверлівыя адносіны. Яны нават сталі вельмі падобныя адзін да аднаго — што знешне, што характарам. Многімі сваімі сакрэтамі ўнук дзяліўся толькі з дзедам.

І вось яны сядзяць за кухонным сталом і нетаропка п'юць чай. Вядуць ціхую, нязмушаную размову. Алесь Пятровіч цішком прыглядваецца да ўнука, які сёння чамусьці ўсхваляваны больш чым звычайна, і адчуваецца, што хоча расказаць нешта важнае, але чамусьці вагаецца.

Нарэшце Алесь Пятровіч запытаўся напрамую:

— Міколка, у цябе штосьці здарылася?

— Ды не... Нічога асаблівага... — збянтэжыўся той. — Проста хацелася б параіцца... Памятаеш, я табе расказваў пра Віялету, сваю былую аднакурсніцу?

— Памятаю. Ты нават картку яе паказваў. Прыгожая дзяўчына.

— Дык вось... Мы дружым з ёю ўжо другі год, а я ніяк не магу зразумець, што яна за чалавек. Нейкая скрытная, капрызлівая. З-за гэтага пастаянна сварымся, пакутліва высвятляем адносіны. А цяпер мне здаецца, што мы падышлі да той мяжы, калі трэба вызначацца: альбо сыходзіцца і быць разам, альбо разбягацца канчаткова... Што ты мне параіш, дзядуля?

— А што ж я магу табе, унучак, параіць? Гэта павінен вырашаць ты сам. Толькі ты і ніхто іншы.

І, гледзячы на засумлены твар унука, Алесь Пятровіч усміхнуўся:

— Не перажывай, Міколка. Не ты першы трапляеш у такую сітуацыю, не ты апошні... Хачу табе даць пачытаць адну рэч.

Алесь Пятровіч падняўся з-за стала, накіраваўся ў свой кабінет і праз хвіліну выйшаў адтуль з тоўстым сшыткам у цёмна-сіняй вокладцы.

— Гэта мой дзённік студэнцкай пары. Вазьмі пачытай. А пасля мы прадоўжым нашу размову.

Дома Мікола, умасціўшыся ў мяккае крэсла, разгарнуў дзедаў сшытак і паглыбіўся ў чытанне...

Нядзеля. У хаце — цішыня.

За акном ідзе мяккі, бухматы снег...

Я — дома. Сесія, пяць экзаменаў якой даліся мне няпроста, засталася ззаду. На душы прыемная палёгка. І з-за таго, што ўсе экзамены здаў на выдатна, і з-за таго яшчэ, што наперадзе чатыры месяцы вольніцы. Ні лекцый, ні практычных заняткаў, ні залікаў. Толькі доўгачаканая практыка ў абласной газеце «Заря». Брэст я выбраў не выпадкова. Там вучыцца ў педінстытуце Надзя, мая каханая. І ўсе чатыры месяцы мы будзем побач! І ад гэтага на душы светла, радасна.

Хаця адносіны нашыя цяжка назваць бязвоблачнымі. Вось ужо шосты год, як мы, кажучы па-народнаму, жаніхаемся, а яснасці пакуль аніякай. Наадварот, з кожным годам адносіны становяцца ўсё больш заблытаныя, пакутлівыя, няпэўныя. Мы бясконца сварымся, мірымся, зноў сварымся. Надзя па-ранейшаму застаецца для мяне незразумелай, загадкавай, а яе ўчынкі часам мала паддаюцца здароваму сэнсу. Вось чаму на гэтую практыку ў мяне вялікія надзеі. Будучы побач такі працяглы час, я спадзяюся, што мы нарэшце прыйдзем да нейкага канкрэтнага рашэння.

Аднак ехаў я дадому з трывожным пачуццём. Баяўся, што, як і на ранейшых канікулах, мы зноўку з-за якога-небудзь непаразумення пасварымся, і тады ўсе мае мары-спадзяванні на практыку пойдуць прахам.

На шчасце, усё склалася інакш. Яна вельмі тонка адчувае мой настрой. І на гэты раз была добразычлівая, прыветлівая. Вечарам, калі зайшоў па яе, каб разам пайсці ў кіно, яна чамусьці ўжо ляжала ў пасцелі.

— Ай, нікуды не хочацца ісці...

Тады распрануўся і я. Сядзім, гаворым, а ў галаве ў мяне б'ецца, не сунімаецца думка: «Запытаюся вось зараз, ці кахае яна мяне, і калі адкажа, што «не» — сыду і справе канец».

Пачалі балавацца. Я выключыў настольную лямпу. Яна прамаўчала. Тады прысеў на ложак, абняў яе, і раптам адчуў трапяткія дрыжыкі ў яе целе. Гарачая, нястрымная хваля пачуцця захліснула мяне, і я прагна прыпаў да яе вуснаў...

Гэта былі хвіліны, якія рэдка здараюцца ў маім жыцці. Я кіпеў, я гарэў, мне хацелася плакаць, смяяцца ад шчасця. Я цалаваў яе вусны, шчокі, вочы, валасы, і захмялела, страсна шаптаў:

— Родная мая... Каханая... Надзейка...Скажы, ты хочаш, каб мы заўсёды-заўсёды былі разам?

Яна на нейкае імгненне застыла, а пасля парывіста абвіла мяне за шыю і прытулілася моцна-моцна.

Словам, усе канікулы мы правялі разам. Не абышлося, канешне, без прыкрых сварак, але ўсё ж добрага, прыемнага было куды больш. Разам мы прыехалі і сюды, у Брэст.

У рэдакцыі мяне сустрэлі надзвычай добразычліва. Галоўны рэдактар, хударлявы, пажылы ўжо мужчына, доўга і зацікаўлена распытваў: хто я, адкуль, ці маю які вопыт газетнай працы? І чамусьці абрадаваўся, калі я сказаў, што два гады працаваў у раённай газеце.

— Ну што ж, — заключыў ён свае роспыты, — вы прыглядайцеся да нас, а мы будзем прыглядацца да вас. А на практыку прызначу вас у ідэалагічны аддзел. Не палохайцеся — загадчыкам там у нас вельмі творчы, таленавіты чалавек, Васіль Аляксандравіч. Я ўпэўнены, вам з ім будзе не проста цікава, а і карысна папрацаваць. Пазнаёміцеся з літаратурным работнікам гэтага аддзела Анатолем Гараем, маладым паэтам. Дарэчы, у аддзеле часта збіраецца наша творчая моладзь, ідуць гарачыя дыскусіі. І з гэтага боку вам будзе цікава. Так што, поспехаў! Калі што — заходзьце, мае дзверы для супрацоўнікаў заўсёды адчыненыя.

Васіль Аляксандравіч аказаўся чалавекам надзвычай занятым. Ён сядзеў за сталом увесь у нейкіх паперах, заклапочана іх перачытваў, хмура перакладваў, тасаваў, пры гэтым не перастаючы пыхкаць цыгарэтай.

— Так, мне толькі што званіў галоўны... — падняў ён галаву на маё прывітанне. — Прабачце, я зараз у запарцы. Знаёміцца будзем крыху пазней, а пакуль ідзіце ўладкоўвайцеся ў інтэрнат. З кіраўніцтвам інстытута дамоўлена. Гэта тут недалёка, па вуліцы Ленінскай. Заўтра з раніцы прыходзьце на працу, прыкінем вашыя планы на бліжэйшы час.

Зірнуўшы ў паперку, якую мне даў Васіль Аляксандравіч, я ледзь не ўскрыкнуў ад радасці: гэта быў адрас Надзінага інтэрната! Значыць, мы будзем з ёю жыць не толькі ў адным горадзе, але і ў адным інтэрнаце. На такую ўдачу я нават не разлічваў. Гэта — добры знак!

І першая, нечаканая непрыемнасць. Мы — пасварыліся.

А пачалося ўсё вось з чаго. На канікулах Надзя мне расказала, што яе бліжэйшая сяброўка Вольга гаварыла ёй пра мяне, нібыта я зусім не такі, якім мяне ведаюць, што я гуляка і падманшчык, і г.д. і т. п.

У першы ж дзень, пры засяленні ў інтэрнат, я сустрэў Вольгу ў калідоры інтэрната: яна таксама вучыцца ў педінстытуце. Яны з Надзяй былі аднакласніцамі і разам паступілі ў педагагічны.

Я быў непрыемна ўражаны такой характарыстыкай: што Вольга можа пра мяне ведаць? Мой блізкі сябар Іван, які сустракаецца з Вольгай, наўрад ці мог такое пра мяне нагаварыць. Значыць, тут нейкі разлік. Яе родны брат Аркадзь, першы на вёсцы гарманіст і весялун, адзін час меў да Надзі пэўны інтарэс. І я нават сур'ёзна раўнаваў да яго, але Надзя пераканала мяне, што нічога, акрамя сяброўскіх адносін, у іх няма. Тым не менш у Аркадзя, відаць, засталіся больш далёкія планы. І з дапамогай сястры ён вырашыў пасварыць, развесці нас з Надзяй.

І вось, сустрэўшы Вольгу, я не вытрымаў, запытаўся, што яна думае пра мяне. Вольга імгненна ўспыхнула:

— Надзя сказала, так?

— Якая розніца... — пачырванеў я і зразумеў, што дапусціў вялікую памылку.

Надзя мне гэтага не даруе.

І сапраўды. Недзе праз паўгадзіны яна зайшла ў мой пакой. Раздражнёная, злая.

— Ну што? — працяла мяне ледзяным, пранізлівым позіркам. — Выпытаў? Дазнаўся? Так я і ведала! Знайшла каму расказваць! Як ты толькі мог? Пабег, як вясковая баба, высвятляць адносіны... Што ж, гэта мне навука. Дадумаўся! У мяне ў галаве не ўкладваецца...

Я сядзеў, як пабіты. Няшчасны, прысаромлены, марна спрабуючы апраўдацца:

— Зразумей, як усё атрымалася...

— Не хачу нават слухаць! Які сорам! Не, відаць, ты сапраўды не такі... Як жа я магу пасля гэтага табе нешта расказваць? І наогул, як я магу табе верыць?

Я ўзарваўся:

— Ну і не трэба! Калі табе Вольга даражэйшая за мяне, то аб чым размова?

Я падняўся з крэсла, падышоў да акна. Слёзы пякучай крыўды набеглі на вочы. На некалькі хвілін у пакоі ўсталявалася гнятлівая цішыня.

Надзя, як заўсёды, імгненна адчула мой настрой. І загаварыла ўжо зусім іншым тонам:

— Ну, зразумей — яна пасля гэтага скажа мне: «А, ты ўсё роўна ўсё расказваеш...» А мы ж сяброўкі. Давяралі адна адной калі не ўсё, то вельмі многае. А ты? Як ты мог?

Яна нібыта яшчэ працягвала мяне ўшчуваць, але ў голасе ўжо не было ранейшага ледзянога холаду і раздражнення. Я паглядзеў на яе. У вачах зацеплілася прыкметная пяшчота і нешта ад мацярынскага дакору. У мяне радасна тарганулася сэрца.

«Родная мая! — хацелася абняць яе і прашаптаць: — Даруй, калі ласка. Я ўчыніў страшэннае глупства. Больш такое ніколі не паўторыцца...»

Нешта падобнае я і сказаў. У рэшце рэшт, мы памірыліся. Але рассталіся ўсё роўна халаднавата.

Я заўсёды крыўдую і амаль абураюся, калі Надзя не дазваляе сябе цалаваць.

— Гэта не абавязкова, — кажа яна. — Мне дастаткова пасядзець побач, пагаварыць — і ўсё...

А мне — не дастаткова! А я так не магу! Калі цалаваць толькі для таго, каб чмокнуць вуснамі, шапнуць нейкую банальнасць, то я першы аднёсся б да гэтага з пагардай. А мне ж хочацца ўкласці ў пацалунак усё цяпло сваёй душы, усю буру пачуццяў. Пацалунак — гэта самае высокае, самае шчырае прызнанне ў каханні, яго нямы, утрапёны крык.

Канкрэтнага задання мне ў рэдакцыі пакуль не далі. Сказалі, што будуць думаць, але параілі, каб думаў і я, шукаў свае тэмы. І тут я ўспомніў адзін даўні эпізод са сваёй працы ў раёнцы.

...Напрадвесні 1961 года ў рэдакцыю Лагішынскай раённай газеты «Калгасная праўда», дзе я тады працаваў карэспандэнтам, прыйшоў ліст з Давыд-Гарадка. Пісалі юныя следапыты сярэдняй школы № 1:

«Добры дзень, дарагая рэдакцыя!

Мы, вучні старэйшых класаў, пад кіраўніцтвам настаўніка гісторыі Ніколенка Ц. А. паглыблена вывучаем гераічныя старонкі Вялікай Айчыннай вайны. Сёлета мы вырашылі наведаць партызанскія мясціны, дзе ў 1943-1944 гадах ваяваў Цімафей Андрэевіч. І было гэта якраз у вашым раёне. Вельмі просім, каб хто-небудзь з вашых карэспандэнтаў далучыўся да нашай экспедыцыі. Мы будзем у вас на пачатку ліпеня...»

Суправаджаць юных давыд-гарадоцкіх следапытаў рэдактар даручыў мне, як самаму малодшаму супрацоўніку рэдакцыі.

— Табе гэта будзе цікава, — заключыў ён, уручаючы камандзіроўку. — А можа, нават і карысна.

І адпусціў на цэлы тыдзень. Разам з Ніколенкам, былым камісарам партызанскага атрада, і яго выхаванцамі мы пабывалі ў маім родным Лышчы, суседніх вёсках Забараўцы і Пучыны, больш далёкіх Ліпніках і Пагост-Загародску. Сустрэліся з былымі партызанамі, партызанскімі сувязнымі, мясцовымі жыхарамі, якія сваімі ўспамінамі хораша дапоўнілі падрабязнасці і дэталі баявых аперацый. Рэдактар не памыліўся: гэта было не толькі цікава, але і сапраўды карысна. Я пражыў у раёне сямнаццаць гадоў, аднак пра многае, што адбывалася тут у гады вайны, не ведаў і не чуў.

Пазней з Ніколенкам я сустракаўся яшчэ ў Давыд-Гарадку, спісаў цэлы агульны сшытак ягонымі ўспамінамі. Словам, сабраў даволі багаты і цікавы матэрыял. Але сталася так, што я тады так нічога і не напісаў: на дакументальную аповесць фактаў было замала, а для нарыса — мнагавата.

Добра, што захапіў з сабою гэты сшытак: як адчуваў, што ён мне спатрэбіцца. Перачытаў свае запісы і зразумеў, што можа атрымацца неблагі нарыс. Цяпер, напярэдадні 20-годдзя Перамогі, такія матэрыялы ў газеце запатрабаваны.

Нарыс напісаўся лёгка, на адным дыханні. Была якраз нядзеля, выхадны, і я спакойна, з ранку да вечара, змог плённа папрацаваць. Атрымалася мнагавата — ажно дзесяць старонак, спісаных уборыстым почыркам. Скарачаць не стаў: мне падалося, што там усё да месца.

А сёння я аднёс нарыс у рэдакцыю, аддаў яго Васілю Аляксандравічу. Ён, здзіўлены, узяў мой рукапіс, чамусьці недаверліва пакруціў галавою, маўляў, калі гэта я ўмудрыўся гэтулькі напісаць, але ўголас сказаў:

— Добра, пакінь, я пачытаю крыху пазней...

Нешта здарылася: не магу з ёю гаварыць. Як толькі яна побач — мяне нібыта паралізуе містычная сіла. У галаве пуста, ні адзінай думкі. Што ні паспрабую сказаць — атрымліваецца смешна, недарэчна. Гатовы разарваць сябе на кавалкі, а слова, хоць забіце, самага простага слова не магу вымучыць.

Чамусьці не атрымоўваецца ў нас сапраўднага кантакту, сапраўднага ўзаемаразумення. Не адкрываем мы адно аднаму свае душы. Не давяраем. Яна наогул шукае за кожным маім словам задняя думкі. Акрамя таго, занадта розныя ў нас інтарэсы. Калі я пачынаю гаварыць пра літаратуру, пра папулярных сёння паэтаў, яна адкрыта пазяхае і іранічна пасміхаецца. А мяне гэта крыўдзіць. Пасля такіх адносін знікае ўсялякая ахвота ўвогуле што-небудзь гаварыць.

Чарговы непрыемны інцыдэнт.

Мы сядзелі ў чытальнай зале бібліятэкі: яна рыхтавалася да практычных заняткаў, а я гартаў свежыя часопісы. Пасля гэтага запрасіў яе да мяне на чай. На дзіва, дзяўчына ахвотна згадзілася.

Прыйшла. Знайшла на стале сшытак з маімі вершамі. Пачала чытаць. Мне стала няёмка. Я забраў ад яе злашчасны сшытак. Пакрыўдзілася:

— Ладна, і не трэба. Каб больш ніколі і не даваў.

Пасля знайшла аркуш паперы, на якім запісаў думку, што мільганула была ў галаве. Пра каханне. Я зноў адабраў.

І тут Надзя паднялася. Вочы сталі чужымі, калюча-халоднымі. Я вельмі баюся такіх яе вачэй.

— Ну што ж... — выдыхнула яна пагрозліва. — Да пабачэння...

— Што «да пабачэння»? — сумеўся я і памкнуўся да яе.

— Не, не... Пайду дадому.

Я пацісНуў плячыма і выйшаў правесці. Яна азірнулася, холадна, нядобра ўсміхнулася:

— Што ты мяне праважаеш? Зайду і сама.

У гэтую секунду адчуў у грудзях, каля сэрца, рэзкі, балючы штуршок.

— Сама дык сама... — ледзь выдыхнуў я, павярнуўся і пайшоў назад.

У пакоі не ведаў, што рабіць: смяяцца, плакаць, злавацца? І так моташна, непрыемна стала на душы, што я нават сплюнуў. З прыкрасцю, з горыччу і болем.

— Усё! К чортавай мацеры! Хай ідзе. І я не пайду больш да яе. Ніколі. Нізавошта. Калі такое каханне — то лепш ужо ніякага...

Недзе праз гадзіну Надзя вярнулася. Я стаяў каля акна, у цемнаце, невідушчымі вачыма глядзеў на асветленую вуліцу і перабіраў свае горкія думкі. Яна далікатна пастукалася і ціха зайшла.

— Што ты там глядзіш?

— Так, на вуліцу, на людзей...

Я зірнуў на яе, прыціхлую, мне нават падалося, крыху вінаватую, ступіў да яе, узяў за плечы:

— Надзя, давай пагаворым. Шчыра, адкрыта...

— Давай.

Гаварылі доўга, пра ўсё. Пра нашы незразумелыя, заблытаныя адносіны. І здаецца, прыйшлі да агульнай высновы, што так далей нельга, трэба вучыцца пазбягаць дурных сварак, усе непаразуменні высвятляць спакойна, разумна, паважліва.

Не чакаў, што нарыс надрукуюць так хутка. Але самае прыемнае, што практычна нічога не скарацілі. Матэрыял заняў добрых паўпаласы. А яшчэ больш прыемна, як паведаміў мне па сакрэце Толя Гарай, што нарыс адзначылі на лятучцы. Чаму па сакрэце? Загадчык папрасіў нічога пакуль мне не гаварыць, каб я часам не зазнаўся. Маўляў, хлопец, мяркуючы па ўсім, здольны, але яму яшчэ шмат чаму трэба вучыцца. Што ж, з радасцю буду вучыцца, на шчасце, ёсць у каго.

У інтэрнат я вяртаўся, як на крылах. Прыхапіў некалькі экзэмпляраў газеты з надрукаваным нарысам і паклаў іх на стале, на самым відным месцы. Спадзеючыся, што вечарам Надзя прыйдзе да мяне, зацікавіцца газетаю, разгорне яе, убачыць мой нарыс. І гэта будзе для яе сюрпрызам. Ага... Прыйшла, на газеты нават і не глянула. Не папыталася, як я прыжываюся ў рэдакцыі, што збіраюся рабіць, як будзе арганізавана мая практыка. Пасля гэта мне расхацелася гаварыць ёй пра сваю першую ўдачу.

Толькі што з камандзіроўкі. За пяць дзён адмахаў больш чым паўтысячы кіламетраў, аб'ехаў амаль паўвобласці. Сустрэўся з дзясяткам цікавых людзей. Убачыў, дазнаўся шмат новага. Але самае галоўнае: у душы сваёй я прывёз агромністы зарад радасці, цеплыні, добрасці ад шматлікіх сустрэч. Таму што харошыя людзі як сонцы: нясуць у сабе жыццядайнае святло, саграваюць, духоўна ўзбагачаюць.

Хочацца запісаць асобныя дарожныя эпізоды.

...Бабулі відавочна не сядзелася. Яна ўсё нешта мулялася, паварочвала галаву то да аднаго суседа, то да другога — хацела загаварыць. Нарэшце не ўтрывала, папыталася ў мужчыны, які быў справа:

— Скажыце, а гэтым аўтобусам я траплю прама ў Пінск?

— Трапіце, бабуля, трапіце.

— То добра. Без усякіх перасядак... І далёка той Пінск?

— Сто дваццаць кіламетраў.

— Уга, ні разу так далёка не ездзіла. А от на старасці давялося.— Бабуля зірнула і на суседа злева, як бы і яго запрашаючы да размовы.— Гэта ж я да сына еду. У госці. Даўно ўсё мяне просяць, і ён, і нявестка, прыедзьце ды прыедзьце. А калі не прыедзеце, то мы, кажуць, хоць пасылку прышлем вам. І праўда, прыслалі. Штапелю на сукенку, кофтачку такую файную, хустачку во гэтую...

Старая з гордасцю паправіла на галаве квяціста-чырвоную кашаміравую хустку і нават трохі памаўчала, як бы даючы магчымасць разгледзець, ацаніць сынаў падарунак. Пасля ўсміхнулася:

— А я от усё адно рашыла з'ездзіць. Раней не было як. То мароз, то дзень кароткі, а цяпер пакінула хату на ўнучку дый паехала.

— Адкуль жа вы самі?

— З-пад Бярозы. ГРЭС, можа, чулі? Ну, от адтуль, сыночку. Раней у нас калгас быў, а цяпер ужо саўгас. Дак маладыя ўсе на ГРЭСе. Я і свайму пісала, каб вяртаўся бліжэй да дому. На ГРЭСе мог бы рабіць. Не хоча. Кажа: «І я ўжо да людзей прывык, і людзі да мяне». Яго там паважа-а-юць, Бог ведае як паважаюць. А вы самі не з Пінска будзеце?

— З Пінска.

— О, то вы, пэўна, і сына майго ведаеце? На фабрыцы ён, дзе кофтачкі робяць. За інжынера.

— Як яго прозвішча?

Старая назвала.

— Не, не ведаю,— пакруціў галавою сусед і, убачыўшы расчараваны твар суседкі, заспакоіў:— Я, праўда, на фабрыцы гэтай ні разу не быў. Так што не дзіўна... А ваш сын даўно там працуе?

— Дзясяты год.

— І вы першы раз едзеце ў госці?

— Не падумайце чаго. Яны запрашалі. Многа разоў запрашалі. Але, я ж кажу, усё не было як. А цяпер во рашылася... Унучка напісала ім, калі, якім аўтобусам буду ехаць. Сустрэнуць мяне. Пэўне, чакаюць ужо. Далёка яшчэ да Пінска?

...На вакзале бабульку ніхто не сустрэў.

Сусед памог ёй узяць таксі і, пакуль машына не схавалася за паваротам, задуменна глядзеў услед.

...Старому ўжо сёмы дзясятак. Праўда, трымаецца ён яшчэ малайцом. Бадзёры голас, лёгкая паходка. Аматар пагаварыць. Узрост выдаюць хіба што глыбокія маршчыны на твары ды вялікая лысіна. А яшчэ — замурзаныя ватныя нагавіцы, якія трымаліся ледзь не на каленях.

Сам ён родам з-пад Пінска. Нарадзіўся, вырас і дзяцей пагадаваў у вёсцы. Але вось ужо больш за дзесяць гадоў працуе ў горадзе, на будаўніцтве. Туляецца па інтэрнатах, есць як і дзе прыйдзецца.

— Дзед, — пытаюся ў яго, — няўжо вам такое жыццё падабаецца? Вы тут, сям'я там...

— Справа не ў тым, падабаецца ці не падабаецца.... Трэба ж неяк жыць. А ў нашым калгасе ногі можна працягнуць.

— Колькі ж вы палучаеце? Рублёў сто?

— Ды ну сто! Рублёў пяцьдзясят-шэсцьдзясят.

— Ну вось. Дык ці варта з-за гэтага цярпець такія нязручнасці? Хай маладыя — ім гэта па душы. А вы ж ужо сталы чалавек. Вам бы ўжо і адпачыць не грэх. А чым цяпер кепска ў калгасе? Хай сабе заробак невялікі, затое ёсць соткі, карова, кабанчык, куры...

— Затое ў мяне заўсёды жывая капейка.

Вось яна, даўняя сялянская ідэалогія — капейка! Дзеля гэтай капейкі чалавек гатовы цярпець што заўгодна. Толькі яе ён лічыць заробкам. А тое, што ў калгасе атрымоўвае жыта, бульбу, буракі, — гэта проста так.

І вось гэты шасцідзесяцігадовы мужчына ў мароз, у дождж за тры кіламетры ходзіць на работу пешкі — каб не плаціць за аўтобус, толькі каб заставалася жывой яго ўсемагутная ўладычыца-капейка.

... Ніяк не магу забыць аднаго чалавека — Іллюка Маркава з Забараўцаў. Які ж у яго выразны твар: маршчыністы, злёгку выцягнуты, з рыжымі абкуранымі

вусамі. Калі гаворыць, у роце бачныя два жоўтыя зубы, якія тырчаць знізу, як клыкі. Але галоўнае — гэта вочы! Д'ябальскі вясёлыя, хітрыя, у якіх час ад часу скачуць гарэзлівыя чорцікі. Расказвае што-небудзь і міргае адразу абодвума вокамі.

— От, брат, у вялікім аўтобусе ехаць любата. І не чуваць. Нібы па маслу. Гэто ж я нядаўна ехаў у Мінск. Дак яно толькі слупы ляцяць. І машыны міма — фур! фур-р! А ў горадзе што робіцца! І сюды машыны, і туды машыны. І куды яны ўсе едуць, ліха іх матары знае...

...Мы часам лаем нашу моладзь, крытыкуем яе як толькі можна. А таго разумець не хочам, што часта бачым у маладых знешняе, выпадковае, неістотнае.

Мне давялося быць сведкам адной сцэны ў інтэрнаце будаўнічага ўпраўлення. Размаўлялі двое хлопцаў. Слухаць іх было сорамна. Праз слова — блатны жаргон, праз два — мат.

Але, як я пасля даведаўся, усё гэта было напускное, павярхоўнае. Ішло не ад іх сутнасці, а ад простага падражання ці то героям кепскіх замежных фільмаў, ці то некаторым старэйшым таварышам. Пазбягаючы высокіх, прыгожых слоў, яны напускалі на сябе знарокавую грубаватасць. Ім здавалася, што так яны выглядаюць больш мужна і стала.

Але ж нельга за гэтым чыста знешнім праяўленнем не бачыць іх сутнасць, закрэсліваць іх сапраўдныя душэўныя і духоўныя якасці. Узяць тых жа двух хлопцаў. Яны, аказваецца, выдатныя маладыя людзі. Абодва — будаўнікі, абодва займаюцца ў вячэрнім тэхнікуме. А нязлосна лаяліся, таму што не маглі дамовіцца, як лепш намаляваць карыкатуру для насценнай газеты, што ляжала побач, на стале.

Раніцай насценгазета ўжо вісела на відным месцы ў калідоры, а хлопцы былі на рабоце.

Прыгадалася мая нядаўняя, калі я быў на канікулах, размова са сваёй старэйшай сястрой. Тады яна папыталася:

— Ну, як у цябе з Надзяй?

— Як звычайна... — адмахнуўся я, не жадаючы ўдавацца ў падрабязнасці. — Нам, відаць, нельга быць разам.

— Будзеце, — цвёрда, з усмешкай прамовіла сястра.

— Чаму так упэўнена пра гэта гаворыш? — здзівіўся я.

— Таму што ведаю.

— Адкуль?

— Ладна, адкрыю табе сакрэт. Нядаўна я гадала на картах і там выйшла, што вы пажэніцеся.

Я пакруціў галавою:

— Наўрад ці... Нешта ў нас чым далей, тым горш.

Цяпер вось тут, у Брэсце, я зноў і зноў пераконваюся, што мы з Надзяй — розныя людзі. Па-першае, я не ўпэўнены, што яна кахае мяне. Дзяўчына, якая кахае, так сябе не паводзіць. Ёй, здаецца, не патрэбны ні мае абдымкі, ні пацалункі.

Па-другое, яна не хоча прызнаваць нічога «майго». Вершы называе пісанінай. Кнігі, якія я хвалю і прапаную пачытаць, яна абыякава адкладвае ўбок. Прафесію маю не разумее, а журналістаў, услед за бацькам, дарэчы, старшы-

нёй калгаса, называе пісакамі. Учора, напрыклад, я вярнуўся з камандзіроўкі, прывёз процьму ўражанняў, а яна хоць бы пра што папыталася. Крыўдна было да слёз. Не выцерпеў, сказаў ёй:

— Табе, Надзя, нішто маё не цікава.

Засмяялася.

А сёння — зноў канфлікт. Зайшоў да яе запрасіць на вечар у інстытуце. Адмовілася катэгарычна:

— Не пайду!

— Ну і чым ты будзеш займацца?

— А табе што да таго?

Я павярнуўся і пайшоў. І гэта не першы выпадак. Адмовілася ісці на канцэрт артыстаў мінскай філармоніі, адмахнулася ад тэатра. А каб схадзіць куды-небудзь на выставу, на каток ці проста пагуляць — і не заікайся.

Учора была субота, і я зайшоў да Надзі, каб разам наведаць інстытуцкую вечарыну.

— Не хачу! — коратка і холадна адрэзала яна.

Я недаўменна паглядзеў на дзяўчыну:

— Што з табою? Чуеш?

— Нічога. А ты, калі хочаш, ідзі.

І я пайшоў. Праўда, не на вечар, а ў свой пакой. Лёг на ложак, і горкія думкі апанавалі мяне. Пасля пакутлівага роздуму вырашыў: калі сёння не прыйдзе — заўтра скажу ёй, што ўсё скончана. Ты не кахаеш мяне і табе проста нялоўка, а можа, нават і сорамна быць са мною. Дык я пазбаўляю цябе гэтых нязручнасцяў...

Яна прыйшла. Якраз у той момант, калі я, як загнаны ў кут звер, змучаны думкамі «прыйдзе — не прыйдзе?», кідаўся па пакоі.

Але размовы не атрымалася. Я, як апошні дурань, маўчаў.

— Ты што, пакрыўдзіўся? — папыталася яна.

Вось тут бы мне ўсё і выказаць. А я, бы той упарты асёл, насуплена маўчаў. Яна пастаяла з хвіліну, уздыхнула:

— Ну што ж... я пайду...

Не паспеў і рот адкрыць, як дзверы зачыніліся.

Злосць мяне ўзяла неймаверная. Не на яе — на сябе. Я гатовы быў разарваць сябе на кавалкі. Дзікун! Асталоп! Не мог толкам пагаварыць з каханай. Яна першай пайшла насустрач, а я — як замок навесіў на рот. Абармот няшчасны!

Ад усяго гэтага ажно застагнаў. Зноў кінуўся на ложак, і слёзы самі пакаціліся з вачэй. Мужчына называецца! Кавалер!

У гэты момант у пакой урываецца Клава — адна са студэнтак, што жывуць у пакоі насупраць.

— А ты чаго ляжыш? — здзівілася яна. — Пайшлі з намі!

— Куды?

— У тэатр, на танцы.

— Якія могуць быць танцы а дзясятай гадзіне?

— О, у нас заўсёды так: пасля спектакля — танцы.

Без асаблівай ахвоты сабраўся, пайшоў. А ў тэатры — Вольга. Убачыла мяне і адразу з пытаннем:

— А дзе Надзя?

Давялося нешта схлусіць, але, мабыць, атрымалася не вельмі пераканаўча, таму што Вольга паглядзела на мяне з усмешкай і пакруціла галавой:

— Ну і капрызная ж дзеўка. А ты на зло ёй пагуляй тут з кім-небудзь.

Я адразу зразумеў, чаго яна дабіваецца: стварыць любую нагоду, каб пасварыць нас з Надзяй.

— Не, Вольга, я не за гэтым сюды прыйшоў.

— Ну, як хочаш. Я ж нічога... Ты Зоі нашай спадабаўся. Запрасі яе на танец.

Я ўсміхнуўся. Не так дык гэтак, усё роўна да свайго хіліць. Аднак Зою ўсё-такі запрасіў.

Калі вярнуўся дадому, святло ў Надзіным пакоі яшчэ гарэла. Значыць, яна не спіць. Мільганула жаданне пагрукацца да яе. Нават падышоў да іхняга пакоя, але не адважыўся. Па-першае, позна. А па-другое, невядома, як яна ўспрыме мой візіт. Падумае: слюнцяй нейкі...

Да гадзіны ночы ў дзяўчат — маіх суседак — пілі чай. Я знарок цягнуў час: хацелася паглядзець, ці ляжа яна раней за мяне альбо не?

А палове другой я здаўся. Прыйшоў у свой пакой, распрануўся і выключыў святло. І ў тую ж хвіліну за фіранкаю яе акна нешта мільганула, і святло пагасла.

Хочацца верыць, што гэта яна чакала, пакуль лягу спаць я. Падумалася: калі б не кахала, то чаго ёй чакаць, перажываць? Значыць, кахае...

«Кахае» — з гэтай шчаслівай думкай я і заснуў.

Сёння ў рэдакцыі зайшла размова аб праблемах сучаснай журналістыкі. У наш аддзел завіталі двое калег — уласныя карэспандэнты рэспубліканскіх газет. Адзін з іх паскардзіўся, што многа часу даводзіцца траціць на так званыя аўтарскія, арганізаваныя матэрыялы.

— Дзе гэта бачна і дзе гэта чутна, — даводзіў ён, — каб, скажам, рабочы зрабіў нейкую дэталь і аддаў яе іншаму? Альбо, напрыклад, пісьменнік напісаў апавяданне і падараваў яго свайму калегу. Чаму ж тады журналіст павінен за некага пісаць і ставіць чужы подпіс?

Яго падтрымаў другі калега:

— Такая практыка разбэшчвае людзей. Чалавек атрымоўвае грошы за матэрыял, да якога ён не мае ніякага дачынення. А пасля яшчэ пачынае плявузгаць, што журналісты грошы заграбаюць лапатай.

— Але самае прыкрае ў тым, — умяшаўся ў размову Васіль Аляксандравіч, — што ўсе гэтыя арганізаваныя матэрыялы аўтараў з тытуламі ніхто не чытае. На такія публікацыі глядзяць, як на пустое месца ў газеце. Таму што яны, як правіла, напісаны стандартна, суха, нецікава. А чаму б не аддаць гэтую справу журналістам? Асабліва тым, хто ўжо заваяваў сабе імя, мае сваіх чытачоў і яго матэрыялы карыстаюцца папулярнасцю...

Эмацыянальная размова не пакінула і мяне абыякавым. За два гады працы ў раёнцы мне і маім калегам такіх матэрыялаў давялося арганізаваць не адну сотню. Пры гэтым, шчыра прызнацца, пісалі мы іх, як кажуць, левай нагой. Таму што разумелі: яны нікому не патрэбныя. Навошта ж гэтая крывадушнасць, гэтая мана?

Але мне здаецца, што мы рана ці позна адмовімся ад такіх жалезабетонных аўтарскіх выступленняў, як ужо адмовілася ад іх «Камсамолка», перастанем загружаць імі газетныя палосы, наганяць на чытача сум. Сёняшні чытач ужо

не той, што быў дзесяць-пятнаццаць гадоў таму. Яму не патрэбны прапісныя ісціны і азбучныя тэорыі. Чалавек бярэ газету ў рукі для таго, каб даведацца пра апошнія навіны, пачытаць што-небудзь важнае, цікавае, карыснае. Мы, журналісты, абавязаны даваць чытачу добротны прадукт, які б выклікаў у яго роздум, прымушаў радавацца альбо гневацца, падштурхоўваў да рэальнага дзеяння.

Аднак мяне, здаецца, занесла. Карацей, я цалкам згодны са сваімі старэйшымі калегамі: у газеце павінна быць як мага меней вось такіх арганізаваных фармальна-казённых выступленняў даярак, свінарак, старшынь калгасаў, рабочых. Лепш хай таленавіты журналіст напіша пра гэтую самую даярку нарыс, замалёўку і талкова, цікава раскажа пра яе жыццё, пра яе працоўны вопыт, і карысці будзе ў дзесяць разоў болей.

А яшчэ падчас нашай стыхійнай дыскусіі зайшла размова пра ганарар. Праўда, тут я са старэйшымі калегамі ў многім не пагадзіўся б. Напрыклад, адзін з іх абураўся:

— Ганарар у нас зусім нікчэмны. За карэспандэнцыю плацяць дзесяць рублёў. Уяўляеце? Ты працаваў цэлы тыдзень, дасканала вывучаў праблему, прапаноўваў нейкія шляхі яе вырашэння, перагаварыў з дзясяткам людзей, пасля пісаў, укладваў душу ў кожны радок і на табе ўзнагарода — дзесяць рублёў. Можна сказаць, працаваў задарма...

Мне хацелася яму запярэчыць:

— Чаму ж задарма? А за што нам даюць зарплату? Рабочаму ж за асобна зробленую дэталь не плацяць. У яго ёсць зарплата. Дык чаму мы, журналісты, за сваю працу павінны атрымоўваць двайную плату? Можа, мэтазгодна гаварыць пра павышэнне самой зарплаты — гэта іншая справа. Але абурацца нізкімі ганарарамі — проста нялоўка.

Так хацеў сказаць я, але не асмеліўся ўступаць у спрэчку з вядомымі, масцітымі журналістамі.

Слухаю па радыё рэпартаж-справаздачу з нарады перадавікоў сельскай гаспадаркі і абураюся: што ж гэта такое? Выступленне сакратара абкама партыі, выступленне даяркі, звеннявога, свінаркі — і ўсё суцэльныя лічбы. Здаецца, што выступаюць не перадавікі сельскай гаспадаркі, вопытныя майстры сваёй справы, а нейкія бухгалтары-бюракраты, якія і жыцця не бачаць за сваімі лічбамі.

А дзе ж аповед пра тое, як былі дасягнуты гэтыя лічбы? Дзе абмен вопытам, дзелавая, канкрэтная парада, таварыская крытыка? Дзе ўсё гэта? Няма яго! З трыбуны, як з парванага меха, сыплюцца лічбы, лічбы, лічбы... Каму яны патрэбныя? Іх, калі гэта некаму неабходна, удосталь можна знайсці ў нашых газетах. А на нарадах размова павінна ісці па-іншаму — канкрэтна, па-дзелавому, зацікаўлена.

Учора паўдня сядзеў над чыстым аркушам паперы і не выціснуў з сябе ні радка. Няма думак, няма натхнення — і нарыс, які ў задуме вымаўлёўваўся такім яркім, такім цікавым, не пайшоў. Перачытваў запісы, зробленыя ў блакноце, перабіраў у памяці жыццёвыя эпізоды, расказаныя маім героем, а сэрца чамусьці не адгукалася на ўсё гэта, прапускала міма, жыло іншым.

Сэрца хвалявала пакутлівая думка: прыйдзе — не прыйдзе? Прыйдзе — не прыйдзе? А калі не прыйдзе, то што рабіць? І наогул, што будзе далей з нашым такім няпростым, такім заблытаным каханнем?

Але яна прыйшла! І, можа, таму, як толькі Надзя з'явілася ў маім пакоі, я імгненна забыўся на ўсё кепскае, крыўднае, што мяне хвалявала і аб чым хацеў ёй сказаць, і адразу заўсміхаўся — радасна і па-дурному.

Аднак яна трымалася халаднавата, адчужана. Паспрабаваў быў яе абняць, прытуліць — ні ў якую. Пажадала добрай ночы і пайшла.

А я ад злосці на сваю дурноту, на сваю нікчэмнасць гатовы быў ірваць на сабе валасы. Ну чаму я з ёю такі бездапаможны, такі няздатны? З іншымі дзяўчатамі я ж і вясёлы, і смелы, і дасціпны. А тут яе прысутнасць як бы паралізуе мяне, выстаўляе ў самым непрывабным святле.

Карацей кажучы, я зусім не ведаю, што рабіць. Трапілі мы ў нейкае д'ябальскае зачараванае кола, і выблытацца з яго цяпер немагчыма. Ёсць, праўда, два выйсці: альбо разбегчыся, парваць усялякія адносіны, альбо... альбо ажаніцца. Але ні таго, ні другога я пакуль зрабіць не магу. Застаецца цярпліва чакаць, што ўсё неяк утрасецца само сабой. Вось ужо праўду кажуць: каханне — гэта як куля: уваходзіць у сэрца, а выходзіць бокам...

Прыходзіў у рэдакцыю Уладзімір Калеснік — малады вучоны, таленавіты літаратурны крытык, выкладчык мясцовага педагагічнага інстытута. Ён жа і кіраўнік літаратурнага аб'яднання пры газеце. Але часцей за ўсё ён забягае да Анатоля Гарая, з якім даўно і хораша сябруе. Падчас такіх адведзінаў само сабой узнікаюць цікавыя размовы — і пра літаратуру, і пра жыццё.

На гэты раз Уладзімір Андрэевіч зайшоў хмуры, заклапочаны і ўжо амаль з парога запытаўся:

— Хлопцы, што гэта здарылася з Пархутам?

— А што? — здзівіліся мы.

— Не ведаю, — пацісnуў плячыма Калеснік. — Кажуць, што выгналі з работы...

— Не можа быць! — падхапіўся Васіль Аляксандравіч і кінуўся да тэлефона.

Аж праўда: у рэдакцыі раённай газеты, дзе ён працаваў, яму ўляпілі суровую вымову з занясеннем і адпусцілі на ўсе чатыры бакі. І ўсё з-за нейкай склочніцы, што атруціла жыццё не аднаму чалавеку ў Баранавічах. І трэба ж было Яраславу напісаць пра яе фельетон ды яшчэ надрукаваць у рэспубліканскай газеце. А ў гэтай склочніцы аказаўся высокі пакравіцель у райкаме партыі.

Пагаравалі ўсе разам пра лёс Пархуты і вырашылі, што трэба яму будзе дапамагчы ўладкавацца куды-небудзь ў Брэсце. Таленавіты ж пісьменнік і журналіст не абы-які...

— З журналістамі заўсёды так! — ажно кіпеў ад злосці Васіль Аляксандравіч. — Служыш верай і праўдай, а ледзь дапусціў якую памылку — можаш аказацца на вуліцы. Падручныя партыі! Але чаму партыйнаму работніку чэсць і пашана, а журналісту, які, па сутнасці, выконвае тую ж работу, — адны шышкі?

І зноў горкі, балючы роздум.

Думаю пра яе бясконца...

Сёння пад раніцу прысніўся (ніколі такога не здаралася) вельмі харошы, прыемны сон. Нібыта абняла мяне каханая і пацалавала. Ды так горача, з такім пачуццём, што я ажно прачнуўся.

Агледзеўся вакол і ўсміхнуўся: такое хіба толькі і можа прысніцца...

Нарыс усё ж такі я напісаў, і яго ўдалося запланаваць. Праўда, з вялікай цяжкасцю. З дапамогай Васіля Аляксандравіча, які на планёрцы паваяваў за мяне.

Ніколі не думаў, што ў нашай рэдакцыі такі бессаромны, такі ганебны гандаль. Кожны стараецца як мага больш надрукавацца, каб атрымаць важкі ганарар. З-за гэтага на планёрках здараюцца гарачыя спрэчкі, а часам нават узнікае непрыстойная сварка.

Сёння — апошні дзень зімы. Па календары. Таму што на дварэ — усё яшчэ мароз і ляжыць снег.

Нейкая хвароба ўбілася ў мае вантробы. Не сёння і не ўчора, а яшчэ недзе з год таму. Раніцаю, пакуль я не пап'ю чаю альбо чаго-небудзь не з'ем, пячэ ў страўніку, а вечарам баліць, ные у правым баку, там, дзе печань. Напэўна, усё гэта вынік нерэгулярнага харчавання, перакусаў усухамятку.

Спадзяваўся на цяперашнюю практыку. Думаў, будзе больш-менш спакойнае, без нерваў жыццё, нармальная, паўнацэнная ежа, і я за чатыры месяцы папраўлю здароўе. На жаль, усё пайшло зусім не так, як я планаваў. Тыднёвая камандзіроўка, падчас якой і спаць давялося мала, і есці — дзе прыйдзецца, як прыйдзецца, выматала мяне фізічна ўшчэнт, і стан мой прыкметна пагоршыўся. Да таго ж маральна, псіхалагічна мне вельмі складана з Надзяй.

Зноў-такі, я думаў, солодка марыў: як толькі прыедзем у Брэст, першае, што зраблю, папрашу Надзю стаць маёй жонкай, і калі яна згодзіцца, гэтыя чатыры месяцы абвесцім нашымі заручынамі. А летам, на канікулах, згуляем вяселле. А тут нечакана — адна сварка, другая, і пайшло-паехала. Атрымалася не да заручынаў...

Я стараюся не здавацца, не апускаць рукі. Раніцаю раблю фізічную зарадку, абліваюся халоднай вадой. У рэдакцыю хаджу пешкі, а гэта туды і назад недзе кіламетраў пяць. Рэгулярна наведваю сталоўку. І тым не менш боль у жываце турбуе мяне. І ўсё часцей, і ўсё больш настойліва.

Гэта, вядома ж, выбівае з каляіны. Пазбаўляе неабходнай упэўненасці. Часам настрой бывае змрочны і даволі песімістычны. Вось і сёння, перажыўшы чарговы прыступ болю, вырашыў: нельга мне, такому хвораму, жаніцца. Навошта чалавеку, якога кахаеш, прыносіць лішнія клопаты?

Пакутлівая нервовасць з Надзяй працягваецца. Цяпер яна прыходзіць да мяне амаль кожны вечар, але пабудзе дзве-тры хвіліны, пажадае «добрай ночы» і сыходзіць.

Нядаўна ў нашым аддзеле ўзнікла чарговая дыскусія. На тэму кахання.

Адзін з аўтараў газеты, па прафесіі юрыст, а ў вольны час крыху вершаплёт, выказаўся на гэты конт даволі катэгарычна:

— Ніякага кахання няма. Прыдумалі ўсё гэта маладзёны-рамантыкі ды далёкія ад жыцця паэты. А ёсць простая прывязанасць, узаемаабумоўленасць і, калі хочаце, элементарная неабходнасць стварыць сям'ю, жыць у пары.

Не магу з гэтым аніяк пагадзіцца. Ну якая неабходнасць прымушае мяне дні і ночы думаць пра Надзю, песціць, люляць у сэрцы яе імя? Якая тут прывязанасць, калі яна прыносіць мне больш пакут, чым радасці? Але ж я кахаю яе! І кахаю па-сапраўднаму, глыбока, апантана і нічога з сабою зрабіць не магу.

Прыгадаліся мне словы Надзі, якія яна сказала на канікулах. Перад гэтым мы недарэчна пасварыліся, раз'ехаліся і цэлы месяц нават не пісалі адно аднаму лісты. А калі я прыехаў дадому і зайшоў да яе, то было бачна, што яна радая майму прыходу, а крыху пазней прызналася:

— Я так чакала гэтай сустрэчы... Дні і ночы лічыла. Не магла дачакацца...

Нешта падобнае перажываю цяпер і я. Не магу дачакацца вечара. Хочацца пагаварыць з Надзяй сур'ёзна, разважна, прынцыпова. Хопіць ужо нам гуляць у ката і мышку. Перада мною, кажучы па-вучонаму, «условно-категорический силлогизм с исключительным значением». А па-простаму выбар: альбо — альбо.

Аднак пакуль нічога не атрымоўваецца. Яна на такую размову не ідзе. Выбрала самы горшы варыянт: псаваць нервы, выпрабоўваць маё цярпенне. Навошта? Дзеля чаго? Не разумею...

Калі я і не зраблю таго, што задумаў у сваім жыцці, то прычынаю гэтага будуць тры мае ворагі: лянота, кепскае здароўе і няўпэўненасць у сабе, у сваіх сілах.

Мне заўсёды непрыемна, крыўдна, калі Надзя кажа пра які-небудзь мой недахоп. А сёння падумаў, што крыўдую я, магчыма, дарма. Магчыма, гэта якраз і добра, што яна прымушае мяне задумвацца над сабой, узважваць, асэнсоўваць кожнае слова, кожнае дзеянне.

Аднойчы яна сказала, што я люблю пасмяяцца з чалавека, крытычна адгукаюся пра сваіх знаёмых. Я тады рашуча запярэчыў: ніколі такога не было і быць не можа! А ўчора і сёння — двойчы падрад! — злавіў сябе на тым, што менавіта так і паступаю.

Прыйшлі мы з Пятром у кінатэатр. Пятро — старшакурснік, які таксама праходзіць тут, у газеце, практыку. Хлопец ціхі, памяркоўны, толькі для сваіх гадоў крыху паўнаваты. Селі. Крэсла пад Пятром натужна зарыпела. Я пажартаваў:

— Капітальна ты ўсеўся, ажно крэсла прагнулася.

Пятро паглядзеў на мяне недаўменна, і я зразумеў, што пажартаваў няўдала. Пачаў нешта гаварыць, каб загладзіць свой промах.

А сёння прыйшоў у аддзел нейкі малады чалавек і ўзяўся крытыкаваць мой нарыс пра Ніколенку: маўляў, і наіўна, і банальна, і непраўдападобна... А калі ён сышоў, я папытаўся ў Васіля Аляксандравіча:

— Хто гэта такі?

— Расіхін.

І тут у мяне вырвалася:

— А-а, гэта той бяздарны журналіст, пра якога нядаўна ішла размова!

У Васіля Аляксандравіча ажно папка вывалілася з рук:

— Ну ты! Ведаеш...

І сапраўды: адкуль у мяне такая рэзкасць? Ну хай гэта вырвалася знячэўку, без злосці, але ж вырвалася — з маіх вуснаў, з маёй душы. Так што Надзя мае рацыю, калі мяне крытыкуе.

І, напэўна, куды больш карысна і неабходна гаварыць чалавеку пра яго недахопы, чым крывадушна, незаслужана хваліць. Іншая справа, што Надзя гаворыць мне пра гэта не заўсёды добразычліва, часам, як мне здаецца, нават з нейкай злараднасцю: ага, маўляў, і ты не бязгрэшны. Але факт застаецца фактам: мая каханая крытыкуе мяне справядліва.

Аднойчы Надзя сказала:

— Ты ж мужчына, павінен быць мацнейшы. А табе не так скажаш слова — крыўдуеш. Ледзь што якое — злуешся. Хіба можна так? А я шкадаваць не магу, мне тады хочацца рабіць на зло.

Што ж, пастараюся быць спакойным. Рабі што хочаш. Не прыйшла — нічога страшнага. Прыйшла і маўчыш — памаўчу і я. Не хочаш абдымацца — і не трэба.

Яна па-ранейшаму стрыманая, але ўжо не такая адчужаная, далёкая. У голасе, ва ўсмешцы ўгадваецца пэўная цеплыня, жаночая мяккасць, дабрыня. Словам, мы каторы дзень не сварымся, але і радасці вялікай ад гэтага няма. Мне ўсё здаецца, што гэтая цішыня нейкая ненатуральная, што рана ці позна яна выбухне бурай.

І бура здарылася! На шчасце, зусім не тая, якую я чакаў. У нас атрымаліся два чароўныя, казачныя вечары. Яна была на дзіва добрая, ласкавая, пяшчотная. Я мог штохвілінна яе цалаваць, абдымаць, прызнавацца ў каханні. Я літаральна млеў, раставаў ад шчасця. Былі хвіліны, калі баяўся, што ўсё гэта — нейкі фантастычны сон, і дастаткова мне паварушыцца, як усё імгненна развеецца, знікне, згубіцца...

І толькі два невялічкія моманты, як дзве хмаркі ў сонечны вясновы дзень, прамільгнулі за ўвесь гэты час.

Я сказаў:

— Надзя, ну чаму мы з табой пастаянна сварымся? Навошта нам гэтыя праклятыя непаразуменні? Хіба можна кахаць і бясконца высвятляць адносіны?

Яна засмяялася:

— Чаму ты так думаеш? Вер у самае харошае...

І ўсё. І ні слова болей.

Другі эпізод. Яна на імгненне задумалася, потым павярнула галаву да мяне і неяк вельмі кранальна, даверліва, журботна-мройна прамовіла:

— Ведаеш, Жэня, мне чамусьці іншы раз бывае хораша-хораша, а часам — тужліва, кепска...

— А сёння табе як?

— А табе?

— Мне хораша.

— І мне таксама...

І стала сумная-сумная, задуменная.

Тады я не зусім зразумеў, чаму Надзя так сказала, а цяпер, здаецца, да мяне дайшло. Яна вельмі тонка ўсё адчувае і разумее. Малейшы фальш, драб-

нейшая няшчырасць, ненатуральнасць улоўліваецца ёю, як сейсмографам. А я іншы раз, нягледзячы ні на што, ламлюся напралом.

У каханні так нельга. Неабходна, каб у хвіліны абдымкаў у душах, у нябёсах гучала агульная, невыказна-дзівосная музыка. Калі гэтага няма, калі нехта з дваіх не адчувае такой музыкі — лепш пасядзець, пагаварыць. Інакш атрымаецца фальш, у кагосьці абавязкова ўзнікне раздражненне.

Так, відавочна, здарылася ў нас. Я не ўлавіў, што сёння яна не настроена на ўчарашнюю хвалю, што нам лепш проста пагаварыць, памарыць, і рабіў усё наадварот, лез са саімі абдымкамі і пацалункамі. І паколькі ў яе не было да гэтага ўнутранай, глыбокай патрэбы, то мае слюнявыя пяшчоты прыносілі ёй толькі прыкрасць.

У Брэсце — вясна!

Дні стаяць цёплыя, хаця і трохі хмурыя. Але ў гэтай хмурасці няма той паныласці, якая бывае звычайна восенню. Гэта нейкая харошая, мяккая, прыемная шэрасць.

Паветра чыстае, злёгку вільготнае, насычанае хвалюючымі водарамі.

Усюды — вада, лужы, вясёлыя раўчукі. У парку шумна крычаць гракі. А як толькі на хвіліну выблісне сонейка, на мокрых таполевых галінках усчыняюць задзірыстую валтузню вераб'і.

І ты, і прырода — у чаканні чагосьці новага, радаснага.

Здаецца, мы ўжо сталі прывыкаць да рэгулярных палётаў нашых касманаўтаў. Успрымаем іх, гэтыя палёты, як нешта звычайнае, амаль будзённае. Але сённяшняе паведамеленне ТАСС, па-мойму, ашаламіла ўсіх. Упершыню ў свеце чалавек выйшаў у адкрыты космас! І чалавек гэты — савецкі касманаўт, падпалкоўнік Аляксей Лявонаў. Цэлых дваццаць хвілін ён знаходзіўся за межамі карабля.

Васіль Аляксандравіч прыйшоў з лятучкі ўзбуджаны, засяроджана-заклапочаны. Сказаў, што нашаму аддзелу даручана тэрмінова рыхтаваць водгукі на гэтую падзею. Папрасіў падключыцца і мяне. Я сазваніўся з землякамі і без асаблівай цяжкасці арганізаваў нататку за подпісам калгаснага брыгадзіра, дэпутата абласновога савета. А пасля яшчэ натхніўся і сачыніў невялікі вершык. Паказаў яго Гараю, той ухваліў і сказаў, што пойдзе ў друк.

Адносіны з Надзяй становяцца ўсё больш няпэўнымі. Калі між намі ўсё добра — я шчаслівы. Гатовы звязаць з ёю свой лёс. А калі кепска, калі сварымся ці проста надзьмутыя маўчым, у мяне думкі зусім процілеглыя.

Прыкра атрымалася сёння. Праўда, гэта пачалося, можна лічыць, яшчэ з учарашняга вечара. Нарэшце мы выбраліся з Надзяй у тэатр, і пасля спектакля я папрасіў яе:

— Зойдзем на хвілінку да мяне, дам табе пачытаць адну рэч.

— Якую?

— Ну тую, пра школу. Памятаеш, я табе расказваў?

— Ай, позна ўжо. Давай заўтра.

— Заўтра мне трэба несці яе ў рэдакцыю.

— Ну занясеш дык занясеш...

І так мне крыўдна стала пры гэтых словах, хоць плач. Нішто ёй маё не цікава. Нават тое, што, здавалася б, блізкае дзяўчыне — школа, педагогіка.

А сёння, калі яна прыйшла, размовы ў нас не атрымалася. Маўчаў я, маўчала яна. Так у гнятлівай, напружанай цішыні прайшло, напэўна, з паўгадзіны. А калі зрабілася невыносна, яна ўстала, уздыхнула:

— Ну што ж, я пайду...

А я доўга яшчэ ляжаў у цемені і горка думаў: ну чаму ў нас усё часцей і часцей не клеіцца размова? Чаму? Капрызы настрою, крыўды? Ёсць, напэўна, і гэта. Але корань зла глыбей. Ён відавочна ў тым, што ў нас вельмі розныя погляды на жыццё, розныя жыццёвыя інтарэсы. Рэдка калі мы ў чым-небудзь сыходзімся. Раней, у школьныя гады, гэта не адчувалася, а цяпер, калі мы пасталелі, рознасць нашых настрояў стала выяўляцца ўсё больш і больш.

Гэта было б яшчэ паўбяды, калі б справа тычылася асобных фактаў, асобных жыццёвых эпізодаў. Не, мы разыходзімся па самых прынцыповых, самых важных пытаннях. Аб сэнсе зямнога існавання, аб мэтах і прызванні сапраўднага чалавека, аб шчасці і няшчасці...

Сумна ўсё гэта, вельмі сумна. А я ж кахаю Надзю. Як жа быць? Што рабіць? Не ўжывемся мы з ёю, ох не ўжывемся. Я не змагу змірыцца з яе абыякавасцю. Трэба ж з некім падзяліцца і сваёй радасцю, і сваім болем. А Надзя нічога майго не прымае.

Безумоўна, у сітуацыі, якая склалася, вінаваты і я. Можа, нават яшчэ больш, чым яна. Я абсалютна бездапаможны з ёю, як дзіця. Не, горш — як цяля. Ну, хіба не смешна, што не магу знайсці тэмы для шчырай, зацікаўленай размовы. Часцей за ўсё сяджу і маўчу, як пень. А трэба гаварыць! Трэба спрачацца, шукаць кампрамісы, ісці адно аднаму насустрач.

Выбары. Народ выбірае сваіх пасланцоў у мясцовыя саветы.

Агітпункт, ён жа і месца для галасаванння, патанае ў кветках, кумачовых плакатах, сцягах. Гарыць яркае электрычнае святло. Гучна грае музыка. Нягледзячы на ранні час, людзі танцуюць, спяваюць, за нешматлікімі столікамі перакусваюць. Стаіць чарга ў буфет — даюць апельсіны. Прыўзняты, святочны настрой. Глядзіш — і сэрца радуецца. Радуецца, пакуль не зазірнеш глыбей.

Вось падыходзіць да стала з бюлетэнямі акуратная, ва ўсім чысценькім вясковая бабуля. Дзяўчына, якая сядзіць за сталом, з прыветлівай усмешкай пытаецца:

— За каго ж вы, цётка Грыпіна, галасуеце?

— А хто ж яго, галуба, ведае, — коратка махае рукою бабуля. — Дайце мне хутчэй якую паперыну ды я пабягу дадому, а то ў печы не топлена.

Пытаюцца ў мужчыны сярэдніх гадоў. Той хмура адказвае:

— А мне якая розніца. За каго прагаласую, за таго і добра...

Хлопец, які, відаць, упершыню прыйшоў галасаваць, трымаецца няўпэўнена, разгублена. На пытанне пра свой выбар густа чырванее:

— Не ведаю... Ніхто мне нічога не гаварыў...

Выбіраюць уладу. У бюлетэні толькі адно прозвішча. Але выбаршчык мае права яго закрэсліць і напісаць іншую кандыдатуру. Вядома ж, ніхто гэтага не робіць. І не толькі таму, што няма такой традыцыі, а яшчэ і таму, што ад стала да урны ісці трэба пад прыцэлам некалькіх пар пільных вачэй. Якое ўжо тут крэсленне...

Ляжаў у цемнаце гасцінічнага нумара. Думаў. Хто я такі? Што зрабіў? Чаму да гэтага часу не напісаў нічога значнага, важнага, не надрукаваўся ў рэспубліканскіх выданнях? І было ад гэтых думак сумна, тужліва.

А пасля нечакана падумалася: а хіба гэта так важна — надрукавацца? І чаму я лічу, што ўжо ўсё страчана? Магчыма, усё толькі пачынаецца? Можа, і мне, як Васілю Кубаневу, кніжку якога нядаўна прачытаў, першую палову свайго жыцця варта глядзець, слухаць, запамінаць, жыць узахлёб, а тады, ужо ў другой сваёй палове, выбіраць з пражытага самае каштоўнае, пераплаўляць яго ў сэрцы і аддаваць людзям...

Што рабіць — абсалютна не ведаю.

Мы стаім на мяжы разрыву. Яшчэ адзін невялічкі крок — і ўсё.

...Ездзілі дадому. Разам. Пачыналася няблага. У дарозе Надзя была ціхая, задуменная, прыветлівая. А скончылася... Нават не хочацца ўспамінаць. Яна проста збегла ад мяне. З'ехала адна, цішком. Мне перад яе бацькамі было хоць у сабакі вочы пазычай.

Едучы ў Брэст, я ажно кіпеў ад злосці і крыўды. Намерваўся выказаць усё, што пра гэта думаю. А прыехаў, убачыў яе, прыгожую, спакусліва прывабную ў лёгкай сукенцы, якая шчыльна аблягала яе стан, і ўся мая ваяўнічасць імгненна развеялася, кудысьці знікла..

— Чаму ты так зрабіла? — папытаўся, стрымліваючы свае пачуцці.

Яна толькі ўсміхнулася, бачачы мой нахмураны, незадаволены твар:

— Так атрымалася. Калгасная машына ішла ў Брэст, а месца было толькі адно. Вось я і паехала.

— А адмовіцца не магла? Мы ж дамаўляліся вярнуцца разам.

— Значыць, не магла.

— Зразумела...

— Што табе зразумела? Што ты вечна ўсім незадаволены? Чаму я перад табой павінна апраўдвацца? — выпаліла яна гнеўна, крутнулася і знікла за дзвярыма свайго пакоя.

А я стаяў, як абліты халоднай вадою, прыніжаны і разгублены. І не крыўда, а пякучая злосць разбірала мяне. Злосць на самога сябе. Бяздарны асталоп! Слюнцяй няшчасны! Так мне і трэба! Не змог нават толкам выказаць сваю крыўду. Яна імгненна перахапіла ініцыятыву, і вінаватым аказаўся я.

Што ж, больш не пайду да яе. І яна, хутчэй за ўсё, не прыйдзе. Чым жа ўсё гэта скончыцца?

Напэўна, гэта спрадвечная хвароба многіх: што маем, не беражом, а, згубіўшы, плачам. Так і з каханнем. Калі яно ёсць, нам здаецца, што ўсё гэта не тое, што галоўнае, сапраўднае пачуццё недзе там, наперадзе. І часам у пошуку таго прывіднага, туманнага губляем тое, што было. І толькі пасля разумеем сваю недаравальную памылку.

А раптам і ў мяне гэтак жа? Бо чаму так пранізліва балюча перажываю наш апошні разлад? Чаму не знаходжу сабе месца? Чаму так баліць сэрца? Чаму не магу забыць яе ні на хвіліну? Я хаджу як у тумане, і то ўголас, то ў думках шапчу:

— Надзейка... Я кахаю цябе... Я не магу без цябе...

А яна не прыходзіць вось ужо трэці дзень...

Які ж усё-такі я нявопытны і бяздарны ў каханні. Учора нарабіў гару дурны недаравальных памылак.

Не вытрымаў, пайшоў, пагрукаўся да яе. Выйшла. Здзіўлена ўскінула бров Пераступаючыся з нагі на нагу, я прамямліў:

— Надзя... Пойдзем да мяне. Трэба пагаварыць...

— Пойдзем, — ахвотна згадзілася яна.

Аднак размовы не атрымалася. Я паводзіў сябе, як апошні дурань. Кры дзіўся, распускаў нюні, нешта бездапаможна лепятаў. Зразумела, што ўсё гэт ў яе, акрамя жаласці, нічога не выклікала. Жаласці і раздражнення.

Яна здзекавалася з мяне, як хацела — іранічна пасміхалася, з'едліва камен тавала, яхіднічала. І канчаткова дабіла мяне, сказаўшы:

— Ты, Жэня, лічыш сябе самым разумным. Але нават Трушко, хаця ты та скептычна пра яго гаворыш, правільна цябе ахарактарызаваў. Усё-такі ён разумны хлопец...

І мне прыгадаўся адзін з танцавальных вечароў мінулага лета. Надзя убачыўшы, што ў залу зайшоў Трушко, літаральна ўся расквітнела. А калі ё яшчэ запрасіў яе на вальс, дзяўчына глядзела яму прама ў вочы і ўсё шчаслів ўсміхалася. І ў той вечар яны пакінулі залу раней, чым скончыліся танцы. Пасл Надзя патлумачыла, што Трушко хацеў ёй сказаць нешта вельмі важнае.

«Ну і што ж ён табе такое сказаў?»

«Сказаў... — твар яе пры гэтым асвятліўся прыемнай усмешкай. — Ты, кажа, Надзя, усё роўна вернешся да мяне і ўсё пойдзе па старой дружбе...»

І вось зноў гэты пракляты Трушко! Пры яго ўпамінанні мяне ажно перасмыкнула.

— Ладна, — прамовіў я. — Не будзем пераліваць з пустога ў парожняе. Усё ясна. Мае адносіны да цябе ты ведаеш, а што рабіць далей — вырашай сама... Даю табе поўную свабоду.

— Даю свабоду... — саркастычна паўтарыла яна і, рэзка кінуўшы мне «добрай ночы!», ляснула дзвярыма.

А ў мяне ў сярэдзіне ўсё перавярнулася — кіпела, гарэла, бушавала. Калі ж крыху супакоіўся, то з жахам убачыў: колькі ж нарабіў памылак. Божа мой! Першая: мне не трэба было ісці да яе. Другая: калі пайшоў ужо, то не варта было пачынаць дурнаватую размову. Бо ўсё гэта ўжо сядзіць у пячонках — і ў яе, і ў мяне. І нарэшце трэцяя недаравальная памылка: я паводзіў сябе як апошні асталоп. Дзьмуўся, усяляк дэманстраваў сваю крыўду, трымаў дыстанцыю. А быў момант, калі мог падысці да Надзі, абняць, пацалаваць — і ўсе непаразуменні расталі б як туман.

Я ж усё зрабіў наадварот. Цяпер яна, канешне, не прыйдзе зусім. Каму патрэбен такі дурань...

Думаю і пра іншае. Чаму людзі так няправільна, так скажона разумеюць мяне? Чаму многія гавораць пра маё зазнайства, маё высакамер'е? Няўжо я і на самай справе такі? О, Божа!.. Як гэта балюча. Як гэта цяжка...

Але найбольш балюча, калі сам сябе пачынаеш ненавідзець, пагарджаць сабой. Жыццё тады становіцца невыносным.

Зрабіў яшчэ адну недаравальную памылку. Пайшоў учора на танцы ў інстытут. Але калі б толькі пайшоў — гэта было б паўбяды. А я прыхапіў з сабой яшчэ Зою, тую самую, якую так не любіць Надзя. Чаму я так зрабіў — не магу

зразумець. Што гэтым хацеў каму даказаць? Што я — нармальны хлопец? Што магу некаму падабацца? Глупства несусветнае!

Увесь вечар я танцаваў толькі з Зояй. А побач, вакол былі Надзіны сяброўкі. Яны паглядвалі на мяне і аб нечым шапталіся...

Цяпер я адрэзаў апошні шлях да прымірэння. Спадзявацца, уласна кажучы, больш няма на што. Але калі здарыцца такі цуд і Надзя прыйдзе да мяне, то я яе нізавошта яе не адпушчу.

Пасля рабочага дня мы з Анатолем Гараем крыху прайшліся па ўжо зялёных брэсцкіх вуліцах..

— Ну як, вы яшчэ не памірыліся? — пацікавіўся Толя.

— Не... І ведаш, што я падумаў? У нас ёсць адзінае выйсце — пажаніцца. Тады ўсё стане намнога прасцей.

Толя ажно прыпыніўся, уважліва паглядзеў на мяне:

— Ты гэта сур'ёзна?

— А што?

— Тады скажу табе прама, не крыўдуй. Ты ведаеш, што такое сям'я?

Я хацеў быў адкрыць рот, але ён не даў мне нічога вымавіць:

— Ні храна ты яшчэ не ведаеш! У цябе пра ўсё яшчэ вельмі туманнае, наўнае ўяўленне. У рэшце рэшт, якое маральнае права ты маеш на тое, каб заводзіць сям'ю? Ну якое? Вось станеш мужам, трэба будзе матэрыяльна клапаціцца пра жонку, пра дзяцей, а адкуль будзеш браць грошы, з якой кішэні? Не, Жэня, жаніцьба — гэта не выйсце. Наадварот, яна зважа цябе па руках і нагах. Перш чым пайсці на такі крок, ты павінен неяк вызначыцца ў жыцці, стаць на ногі, паспець нешта зрабіць. Я падкрэсліваю гэта спецыяльна для цябе, як чалавека творчага. Таму што пасля, калі паявяцца дзеці, ты пісаць ужо не зможаш, не будзе часу...

Гаварыў Гарай горача, шчыра, пераканаўча. І я амаль паверыў яму. Але калі прыйшоў у інтэрнат, стаў перабіраць дэталі размовы, то сёе-тое мне хацелася запрэчыць. Ну чаму, скажам, для таго, каб ажаніцца, абавязкова патрэбны нейкія матэрыяльныя ўмовы? А калі двое закаханых не могуць жыць адно без аднаго? Сядзець і чакаць, пакуль у мужа складзецца кар'ера, з'явіцца пэўны дабрабыт? А па-мойму, гэты дабрабыт удваіх стварыць і хутчэй і лацвей.

Зноў жа, чаму сям'я абавязкова будзе перашкодай для творчасці? Колькі ў нас выдатных пісьменнікаў, якія рана ажаніліся, і гэта не замінала ім пісаць, друкавацца. Наадварот, такія жонкі, як у Льва Талстога, Івана Шамякіна, бралі на сябе значную частку клопату — перапісвалі, перадрукоўвалі, вычытвалі тэксты. Але для гэтага неабходна, каб у сям'і панавала не толькі каханне, а і поўнае ўзаемаразуменне, павага, жаданне дапамагаць адно аднаму.

Я далёка не ўпэўнены, што ўсё гэта будзе ў нас з Надзяй...

У рэдакцыю прыходзіў дужа цікавы чалавек. Аляксандр Іванавіч Самуйлік. Надзвычай каларытная асоба. Знешне вельмі падобны на Чапаева — мужны, залявы твар, зухавата падкручаныя вусы. Ваенная гімнасцёрка ўся ў медалях, а з левага боку на грудзях — ордэн Леніна. Накінь папаху — і без усялякага грыму здымай кіно. У гады вайны яго, дарэчы, так і звалі — наш Чапай. І не толькі за знешняе падабенства, але і за бязмежную смеласць, дзёрзкасць баявых аперацый. У тыя гады ён камандаваў партызанскай дыверсійнай групай,

і адна з аперацый, праведзеных народнымі мсціўцамі, стала сапраўднай баявой легендай.

Вось пра гэта і вырашыў напісаць Толя Гарай, запрасіўшы легендарнага партызана ў рэдакцыю. Васіль Аляксандравіч спачатку быў незадаволены, што чужы чалавек будзе перашкаджаць працы. Але аповед Аляксандра Іванавіча быў такі эмацыянальны, такі захапляльна цікавы, што мы ўсе, хто быў у аддзеле, міжволі заслухаліся і праседзелі амаль дзве гадзіны, не зварухнуўшыся.

Вось як гэта было. На пачатку лістапада 1942 года партызанам стала вядома, што фашысты рыхтуюць для адпраўкі ў Германію чарговы цягнік з гвалтам захопленымі людзьмі, а таксама з нарабаваным у насельніцтва дабром — збожжам, жывёлай, мёдам, яйкамі. У Самуйліка саспела дзёрзкая ідэя: захапіць варожы эшалон, выратаваць людзей ад нямецкай няволі, адабраць у фашыстаў нарабаваны скарб. А яшчэ — паколькі гэта было напярэдадні 25-й гадавіны Вялікага Кастрычніка — праехаць на цягніку пад чырвоным сцягам у варожым тыле, паказаць насельніцтву, што Савецкая ўлада не толькі жывая, але і актыўна дзейнічае.

Ідэя была заманлівая, але вельмі ж рызыкоўная. Самуйлік вырашыў набраць добраахвотнікаў. Першым адгукнуўся разведчык Юрый Логінаў. Да вайны ён працаваў памочнікам машыніста паравоза, і ў задуманай аперацыі яму адводзілася ключавая роля — сесці за рычагі цягніка. Акрамя яго падахвоцілася яшчэ сем чалавек. З кожным з іх Аляксандр Іванавіч не раз хадзіў на дыверсіі і ў кожным быў упэўнены, як у самім сабе.

Глыбокай ноччу падабраліся да чыгункі і праляжалі ў схованцы да раніцы. Толькі недзе ў адзінаццаць гадзін нарэшце паказаўся цягнік, якога чакалі. Адзін з партызанаў, пераапрануты ў форму чыгуначніка, выйшаў на палатно і, энергічна размахваючы чырвоным сігнальным сцяжком, пайшоў насустрач цягніку. Машыніст паравоза, заўважыўшы трывожныя сігналы абходчыка, рэзка збавіў хуткасць. Скарыстаўшыся гэтым, народныя мсціўцы выскачылі з засады і аўтаматным агнём ліквідавалі ахову эшалона. Юрый Логінаў заняў сваё месца ў кабіне паравоза.

Пачатак аперацыі аказаўся ўдалым. Далей пачаўся саракакіламетровы рэйд жменькі смельчакоў у варожым тыле. На станцыях і паўстанках, каля блізка размешчаных ля чыгункі вёсак партызаны рабілі кароткія прыпынкі, раздавалі людзям усё, што было ў вагонах. Рэшткі прадуктаў даставілі ў партызанскі атрад.

На станцыі Вулька пустыя вагоны загрузілі саломай і падпалілі. Логінаў разагнаў палаючы цягнік і накіраваў яго на разбураны мост цераз раку Піну, а сам выскачыў пад адхон.

Анатоль Гарай ажно паціраў рукі ад прадчування творчай удачы. Будучаму нарысу ўжо і назву прыдумаў — «Вогненны партызанскі цягнік».

Я быў дома. Бацькі Надзі перадалі ёй нешта з прадуктаў. Вечарам занёс перадачу Надзі. Яна ўзяла сумку, падзякавала, аднак развітвацца не спяшалася.

Я прапанаваў:

— Давай крыху пастаім...

Мы падняліся на лесвічную пляцоўку, сталі каля акна. Твар у яе быў спакойны, праўда, трохі стомлены, а вочы сумныя-сумныя. Паглядзеў я на дзяўчыну, і сэрца маё сціснулася. Які ж усё-такі родны, дарагі яна мне чалавек. Кахаю

Што ж, цяпер спадзеву на вяртанне не засталося. Як пуста і холадна ... душы. Ратаванне маё ў рабоце. Ды яшчэ, здаецца, у вершах, якія раптам вярнуліся да мяне.

Цікавая рэч. Тут, у Брэсце, як нідзе і ніколі пішуцца вершы. Не-не, дый на...лыне на мяне нешта такое, што выльецца, аформіцца ў прачулыя радкі. Здаецца, нібыта гэта зусім і не вершы, а нейкія каштоўныя пласцінкі, выплаўлены... сэрцам. Прынамсі, адчуванне такое...

Пішацца зараз даволі плённа. Сёе-тое нават самому падабаецца. А... толькі тады, калі я адзін. А як толькі даводзіцца каму паказваць — робіцца ...няёмка, сорамна. Напісанае здаецца такім мізэрным, нікчэмным, бяздарным, што і чытаць знікае ахвота. Мусіць, па гэтай прычыне я і ўцёк учора з пасе...джання літаратурнага гуртка. Надта ж усе таленавітыя, вядомыя сабраліс... там, а я — хто я такі?

Анатолю Гараю, якога паважаю як чалавека і паэта, падабаюцца мае вершы. Але гэта, магчыма, па дабраце душэўнай. Ён хваліць мяне, каб падтрымаць у маім цяперашнім крызісе. А калі гэта шчыра, то, безумоўна, прыемна.

А вечарам Гарай запрасіў мяне на мясцовае тэлебачанне. Выступалі ў прамым эфіры — Васіль Жуковіч, Уладзімір Кулакоў і я. Анатоль прадставіў нас як членаў літаратурнага аб'яднання пры абласной газеце. Я прачытаў два свае лірычныя вершыкі.

Міша Ткачэнка, мой аднагрупнік, які праходзіць практыку ў Гомелі, у абласной газеце, піша, што яму там сумна і нецікава. Павучыцца няма чаму і няма ў каго. Я гартаў гэтую газету — сапраўды, матэрыялаў за подпісам практыкантаў не знайшоў. Адзін жалезабетон, зварганены «лысымі дзядзькамі», як назваў тамтэйшых журналістаў-старажылаў Міша.

На шчасце, у Брэсце атмасфера крыху іншая. Асабліва ў маім аддзеле, дзе літаральна бурліць творчае жыццё. Кожны дзень прыходзяць цікавыя аўтары, узнікаюць розныя спрэчкі, дыскусіі, падчас якіх нараджаюцца арыгінальныя, актуальныя тэмы для публікацый у газеце. Прыемна, што ў гэтым і я прымаю самы непасрэдны ўдзел, што і да маёй думкі тут прыслухоўваюцца ўважліва і паважліва.

Канешне, у тым, што ў аддзеле створана атмасфера цеплыні, павагі, вялікая заслуга загадчыка Васіля Аляксандравіча. Цудоўны чалавек. Таленавіты журналіст. Залатая душа. Часта лаўлю сябе на думцы, што ён — мой ідэал, што я вельмі хацеў бы быць падобным на яго.

Вярнуўся з камандзіроўкі на Лунінеччыну. Уражанні агромністыя! Ніколі не думаў, што гэта такі своеасаблівы і цікавы край.

Праўда, у Лунінецкім райкаме партыі, куды зайшоў далажыцца, мяне спачатку нямала засмуцілі. Сказалі:

— Няўдачна вы прыехалі. У самае бездарожжа. Цяпер нікуды немагчыма дабрацца. Нават за дзесяць кіламетраў ад райцэнтра.

Засмуціўся я зусім. Але ў рэдакцыі раённай газеты мяне натхнілі. Расказалі пра надзвычай цікавы факт. У Гоцку знайшоўся камсамолец, які закахаўся ў баптыстку і здолеў вырваць яе з секты. Яны пажаніліся і, шчаслівыя, чакаюць

уже нашчадка. Але да вёскі восемдзясят кіламетраў! Туды і летам дабірацца няпроста, а пры вясновай распуціцы наогул невырашальная праблема.

На другі дзень я ўжо збіраўся вяртацца ў Брэст. І раптам Слава, інструктар райкама партыі, кажа мне:

— Калі хочаш, можаш трапіць у Гоцк.

Пытаецца яшчэ. Канешне ж, хачу! І неадкладна. Толькі як? На чым?

— Тут, у нас, старшыня мясцовага калгаса. Ён выклікаў машыну, праз дзве-тры гадзіны яна будзе ў Лунінцы, і мы ўсе разам зможам паехаць у Гоцк.

Дамовіліся, што а палове пятай яны заедуць па мяне ў гасцініцу і мы рушым у дарогу. Але хутка казка баецца, ды няскора справа робіцца. Прачакаў я машыну да пяці, да паловы шостай і не выцерпеў, пайшоў да райкама партыі. А Слава са старшынёй калгаса ўжо крочаць мне насустрач.

— Ну што, зачакаўся? — усміхаюцца. — Мы таксама. Машыны няма да гэтага часу. Недзе, мабыць, загразла. Пачакаем яшчэ.

У восем вечара мы махнулі рукою і пайшлі ў кіно. А калі вярнуліся, то машына ўжо стаяла каля гасцініцы. Але ехаць, гледзячы на ноч, не рашыліся. Дамовіліся выехаць заўтра раніцою.

Дарога сапраўды аказалася цяжкай. Наш «газік» з завываннем, са скрыгатам, марудна, метр за метрам прасоўваўся наперад. Нас боўтала так, нібыта мы на маленькім параходзіку трапілі ў пяцібальны шторм.

Праз чатыры гадзіны нарэшце дабраліся да Гаўрыльчыцаў. А наперадзе нас чакала яшчэ дваццаць кіламетраў самага складанага шляху.

І вось ён — Гоцк! Не, тут вы не ўбачыце вёску такой, якую мы звычайна бачым і ведаем. Тут усё інакш. У забудове — ніякай планавасці і строгасці. Ніякіх, у традыцыйным сэнсе, вуліц. Кожны дом як выклік: а я вось нікому не падпарадкоўваюся, дзе хачу — там і стаю.

Адзіны намёк на вуліцу ўяўляе дарога пры ўездзе ў вёску. Зрэшты, і ўезд гэты канкрэтна цяжка вызначыць, дзе ён пачынаецца. Едзеш-едзеш, вакол цябе балота, лес, невялічкія прагалы, мільгаюць злева, справа адзінокія і парныя хаты, і раптам табе кажуць:

— А вось гэта ўжо цэнтр Гоцка.

Калі б зірнуць на вёску зверху, то воку адкрылася б такая карціна: на вялікай лясной паляне, у акружэнні вады і балота, уперамешку з соснамі і бярозамі рассыпана ў беспарадку каля пяцісот дамоў. Каля кожнай хаты — прасторны двор. У двары — куры, гусі, свінні, некалькі кароў, конь. Так, так, не здзіўляйцеся: тут трымаюць яшчэ сваіх коней.

Але самае цікавае, як жыхары Гоцка гадуюць свіней. Вясною супаросную свінаматку гаспадары выпускаюць у навакольны лес. Цэлых паўгода яна жыве і корміцца ў лесе. А восенню вяртаецца дадому. Ды не адна, а побач з ёю з паўдзясятка ці нават і больш няхілых падсвінкаў.

А колькі ў Гоцку пчолаў! Мне расказвалі самі жыхары, што ёсць гаспадары, якія трымаюць каля сямідзесяці вулляў. Мёд збіраюць у ёмістыя металічныя бочкі і кладуць іх пад хлявом. І ніколі, ні разу не было аніякага крадзяжу.

Святла і радыё ў пераважнай большасці вясковых хат няма. Нам параілі зайсці ў адзін з лепшых дамоў. Зайшлі. Дом перагароджаны на дзве палавіны. У першай — вялікая, акуратна пабеленая печ, ля акна — масіўны стол, за якім уся сям'я збіраецца на перакус. А сям'я тут немалая: пяцёра дзяцей ды двое

гаспадароў. Але гэта для Гоцка не характэрна. Ёсць шмат сем'яў, дзе сямёра, васьмёра, а то і адзінаццаць дзяцей.

У другой палавіне хаты — уздоўж глухой сцяны пяць ложкаў з гарой падушак, побач самаробная калыска для немаўляці. На сценах — абавязковыя атрыбуты вясковага інтэр'еру: вышыванкі з катамі, лубачным пейзажам, рамкі з пажаўцелымі сямейнымі фатаграфіямі, асобна, амаль на покуці, — павялічаны партрэт далёкіх продкаў.

У хаце чыста, акуратна. На стале радыёпрыёмнік «Родина», побач — патэфон. Патэфон лічыцца прадметам асаблівай раскошы.

Тутэйшыя жыхары — звычайныя нашы палескія людзі, добразычлівыя, гасцінныя, не без хітраватасці і гумару.

Гоцк багаты кантрастамі. Пасярэдзіне вёскі стаіць шыкоўны двухпавярховы будынак школы, які выглядае тут выпадковым гарадскім госцем. Навакольныя хаты, нібы пужаючыся гэтага нечаканага госця, адступілі ад яго на бяспечную дыстанцыю і стаяць, з цікаўнасцю пазіраюць шматлікімі вокнамі.

А школа, між іншым, варта такой цікаўнасці. Нам са Славам, хоць мы бачылі шмат розных будынкаў, давялося ўвесь час охаць і ахаць. Пафарбаваная падлога, асляпляльна белыя сцены, паравое ацяпленне, электрычнае святло, шыкоўная сталоўка, прасторная, багата абсталяваная спартыўная зала, у настаўніцкай, у некаторых класах тэлевізары.

Дырэктар, дарэчы, выпускнік універсітэта, расказваў нам:

— Ведаеце, як цяжка было змагацца за чысціню. Давялося купіць усім вучням тапачкі і паставіць ля ўваходных дзвярэй дзяжурных, каб прымушалі пераабувацца. Інакш праз месяц ад гэтага харства нічога не засталося б. Цяпер прывыклі — усюды парадак.

Цікавімся ў яго:

— Складана працаваць у глыбіннай вясковай школе?

Уздыхае, усміхаецца:

— Усяляк даводзіцца. Пасля сталіцы цяжка было прывыкаць — ні святла, ні радыё. Нават пошта прыходзіла раз на тыдзень. Але дзякуючы мясцовым уладам многія праблемы ўдалося рашыць. У такой глыбінцы ёсць і свае перавагі. Рэдка прыязджае начальства, у рабоце больш самастойнасці. Да таго ж самая цесная еднасць з прыродай...

І сапраўды, мясціны тут вельмі прыгожыя, паэтычныя. Вакол — некранутае, першароднае харство. Вялікае, вясною падобнае на мора, балота, векавы лес: высокія, як струны, сосны, кранальна задуменныя беласнежныя бярозы.

У паводку вада падступае да самых хат. Гэта спрыяльны час для рыбаловаў. Рыба выходзіць з ракі, забіраецца ў самыя глухія мясціны, пад кусты, і пачынае нерасціцца. Варта толькі паставіць на ноч які нераток ці нават кош — і раніцай там будзе поўна рыбы.

Летам навокал вёскі, у тутэйшым лесе, неверагодная колькасць ягад ды грыбоў. Расказваюць, што падбярозавікі, абабкі ў некаторых сядзібах растуць прама ў двары.

Адно кепска: на гоцкай зямлі не прыжываюцца пладовыя дрэвы: вельмі блізка грунтавая вада. Так і жывуць тут людзі без садоў. Зрэдку можна ўбачыць каля хаты нізкарослую, падобную на саксаул, грушу-дзічку.

Назвы паселішчаў, як і самі мясціны, цікавыя, паэтычныя — Крыніцы, Пад'ясень, Пясчанка, Азярніцы...

Яшчэ такая дэталь — ва ўсіх жыхароў блакітныя-блакітныя вочы. У дзяўчат, у хлопцаў, у дзядоў і бабуль, у дзяцей. У клубе як глянеш наўкол — нібы лён квітнее. Гэта, відаць, ад неверагодна сіняга тут неба, ад вялікай блакітнай вады.

Пра тамтэйшых дзяўчат. Іх прыгажосць някідкая, на першы погляд, нават крыху грубаватая, але калі прыгледзішся больш уважліва, то вачам адкрываецца дзівоснае хараство — глыбіннае, натуральнае, чыстае, як і сама навакольная прырода.

Што значыць для мяне Надзя? Усё, усё, усё. У кожнай маёй думцы — яна. У кожнай маёй справе — яна. Яна — мая радасць, мой боль, мая журба...

Сяджу ў абступленым з усіх бакоў вясновай паводкай Лунінцы. У гасцінічным нумары вечаровы паўзмрок. І чуйная, тужлівая цішыня.

Думаю пра Надзю. Увесь час, кожную хвіліну — пра яе... Не, не магу нават уявіць, што калі-небудзь згублю яе, не змагу дакранацца да ейных рук, удыхаць родны, хвалюючы пах яе валасоў, патанаць у чыстых, глыбокіх, як лясныя азёры, вачах, заміраць на яе вуснах...

О, Божа! Што ж мне рабіць? Што? Колькі ж буду кідацца з адной крайнасці ў другую? Каго мне слухацца — розуму ці сэрца?

Так, я ведаю, што ў многім яна не той чалавек, які мне неабходны, што яна хутчэй за ўсё не кахае мяне. І, нягледзячы на гэта, паводка дзікага, неўтаймоўнага кахання да яе ўсё мацнее, шырыцца і шырыцца. Ад гэтай немагчымасці прыстаць да жаданага берага, ад усведамлення нераздзеленасці пачуцця часам губляеш уладу над сабой.

І ў той жа час я ведаю, што яна мне патрэбная. Вельмі і вельмі патрэбная. Яна — дае мне ўсё: сілы, натхненне, крылы. Як жа мне быць без гэтых крылаў? Як?

Чалавек сеў у наша купэ ў Пінску. Але як толькі цягнік крануўся, мужчына раптам падхапіўся, забедаваў:

— Ай-яй-яй! Забыў туфлі ў чакальнай зале. От стары разявака... Усё, прапалі туфлі. Новенькія, імпартовыя. Вёз дачцэ падарунак. Яна недзе так чакае, так чакае...

Ён усё вохкаў, бедаваў, не могучы знайсці сабе месца. Яму параілі на першым жа прыпынку зайсці да дзяжурнага па станцыі і папрасіць пазваніць у Пінск. Мужчына так і зрабіў. Але, відаць, надзеі на тое, што прапажа знойдзецца, у яго было мала, таму што вярнуўся мужчына з зусім апалым настроем, лёг ніцма на паліцу і моўчкі ляжаў.

Недзе хвілін праз пятнаццаць у купэ зайшла правадніца:

— Хто з вас прасіў пазваніць у Пінск?

— Ну я, — падхапіўся мужчына і ўвесь ажно падаўся да правадніцы.

Тая ўсміхнулася:

— Ну то можаце адпачываць спакойна — туфлі вашыя знайшліся. Дайце мне ваш хатні адрас, і вам іх прышлюць.

Чалавек як і не ляжаў. Радасна-ўзбуджаны, ніяк не могучы стрымаць шчаслівую ўсмешку, усё кланяўся правадніцы:

— От дзякуй вам... От дзякуй. Знайшліся! А-а, ты ска-ажы, а я ўжо ду... прападуць... Аказваецца, свет не без добрых людзей. Будзе падарунак ... цэ... Вялікі вам дзякуй!

І ўсе ў купэ следам за мужчынам радасна заўсміхаліся, як быццам ... знайшлася наша агульная прапажа.

У рэдакцыю прыходзіла адна надакучлівая і даволі дзіўнаватая жанчы... Адабрала ў нас амаль паўдня. Апавядала пра свой гаротны лёс з усімі пад... бязнасцямі і непатрэбнымі дэталямі. З аднаго пераскоквала на другое, эмоц... перашкаджалі гаварыць стройна, лагічна. Слухаць яе было пакутліва: плы... сумбурнага аповеду абрынвалася на нас, як бурлівы вадаспад, і спыніць я... было немагчыма.

А ў чым сутнасць? Аказваецца, даўным-даўно, трынаццаць гадоў таму, ... гэтай жанчыны сышоў муж. Яна добраахвотна дала яму афіцыйны развод. У... пасля разводу пражыла з ім яшчэ двое дзетак. Былы муж, аднак, вяртацца ... хацеў і выхаваннем дзяцей не займаўся. П'янстваваў, распуснічаў. А яна хва... ла, і хварэла вельмі цяжка. Зрабілі адну аперацыю, другую. У рэшце рэшт му... плюнуў на яе і сышоў зусім.

Цяпер жанчына апомнілася і прыйшла ў рэдакцыю з просьбаю: мой муж — нягоднік, вярніце мне мужа. Аднак сказаць аб гэтым прама няёмка, таму я... прыхавала сваё жаданне прыстойнай прычынай:

— Бацька аказвае на свайго старэйшага сына негатыўны ўплыў. Трэба да... гэтаму нягодніку публічную аплявуху.

Але як ён можа аказваць нейкі ўплыў, калі даўно не жыве разам з сям'ёю... ўвогуле, калі верыць словам жанчыны, ніколі не займаўся выхаваннем дзяцей... Аказваецца, бацька час ад часу ўсё ж прыязджаў да іх, пісаў Валерыку пісьм...

А што яна, як стараецца адгарадзіць сына ад гэтага дурнога ўплыву? Anіяк... Больш за тое, ездзіла да былога мужа ў Івацэвічы, дзе ён там жыве ў інтэрна... це і працуе ў нейкай будаўнічай арганізацыі, і прасіла, умольвала яго вярнуц... ці хоць бы забраць да сябе Валерыка.

Словам, чорт нагу зломіць у гэтым блытаным, сумбурным і супярэчлівы... аповедзе. Пасля я доўга хадзіў па гарадскіх вуліцах і ўсё ніяк не мог супакоі... ца. Наўкол было шмат вясновага святла, свежасці, чысціні. Шчодрасць сонца... блакіт неба, пяшчота першай зеляніны. Падумалася: як у прыродзе ўсё гар... манічна, цнатліва. Чаму ж сярод людзей гэтулькі подласці, гадасці, блытаніны... Чаму?

Ноччу не спалася. Нечакана прыйшло натхненне, і напісаўся такі верш:

Месяц шумеў-бушаваў шторм,
Неба расхрыстанае гайдалася...
Секлі маланкі сівы прастор,
Бура, як звер, стагнала-кідалася.
Раптам абрыў — і спакой. Немата.
Хвалі ўспененыя змарыліся...
Толькі сэрцы суладна: «так-так» —
Мы памірыліся.

Так, роўна праз месяц мы памірыліся. Падумаць толькі: цэлы месяц жыл... побач, пад адным дахам, і не сустракаліся, не бачыліся.

Што зараз на душы? Шторм улёгся. Знешне стала спакайней. Але не знікае, мучыць немата. Па-ранейшаму ніякай пэўнасці, ніякай яснасці. І ад таго асаблівага задавальнення няма.

Што ж будзе далей? Можа, мне сапраўды адважыцца на рашучы крок і зрабіць ёй прапанову? Але дзе гарантыя, што, пабраўшыся, мы перастанем сварыцца? А калі будзе яшчэ горш? Не станем жа мы адразу іншымі, як толькі недзе там, у сельсавеце, паставяць у нашых пашпартах пячаткі. Баюся, што ўсё нашае застанецца з намі. Застануцца і прыкрыя, пастаянныя сваркі. А гэта ж пакуты на ўсё жыццё...

У Доме палітасветы прайшоў агульнагарадскі літаратурны вечар. Меркавалася, што ў госці да нас прыедуць Васіль Быкаў, Аляксей Карпюк, Данута Бічэль. Але яны (хай ім будзе добра, гэтым вялікім) не прыехалі. З аднаго боку, гэта кепска — падвялі людзей, а з другога — і добра, таму што зала была амаль пустая. Не багата ў Брэсце аматараў паэзіі.

Тым не менш вечар прайшоў надзвычай цёпла, сардэчна. Відаць, тыя, хто прысутнічаў, аказаліся сапраўднымі аматарамі літаратуры. Яны не шкадавалі апладысментаў, хораша рэагавалі на гумар. А пасля яшчэ доўга не адпускалі нас, беручы аўтографы, распытваючы, што дзе можна пачытаць дадаткова.

Прачытаў і я два свае вершыкі. Сустрэлі прыхільна.

Апошнім часам добра, лёгка пішуцца вершы. Адчуваю нейкі хвалюючы подым, светлы, трапяткі прыліў.

І, разам з тым, выдатна разумею, што гэта яшчэ не сапраўдная паэзія. Я ніяк не выблытаюся з драбналесся. Пішу пра каханне, пра свой душэўны настрой, пра неба, сонца, вясну. Усё гэта добра, але каб выбіцца ў сапраўдны звонкі бор паэзіі, трэба знайсці нешта больш важкае, надзённае і сказаць пра гэта па-свойму, непаўторна. Сказаць так, каб тваё слова знайшло пэўны грамадскі рэзананс. Слова гэтае павінна стаць маім роздумам пра сэнс жыцця, пра маю любоў да роднай зямлі, да людзей. Для людзей, сярод якіх ты жывеш, для якіх пішаш, якім хочаш сказаць нешта важнае, нешта вельмі неабходнае, каб яны над гэтым задумаліся, па-іншаму паглядзелі на вакольны свет.

Задача архісур'ёзная. Але для гэтага ў мяне яшчэ не хапае ні ведаў, ні ўмення, ні таленту.

Міхась Рудкоўскі, калі мы ўчора вярталіся з рэстарана, нечакана прапанаваў:

— Давайце, сябры, спяём нашу, беларускую, «Рэчаньку».

Мы ўзяліся нястройна, нядружна цягнуць:

Ой, рэчанька, рэчанька,
Чаму ж ты няпоўная?

І, да вялікага сораму, далей першага куплета справа не пайшла. Ніхто з нас слоў хрэстаматыйнай песні не ведаў. Міхась напусціўся на мяне:

— Ну, давай спявай, ты ж самы маладзейшы з нас, павінен ведаць. Хіба ні разу не чуў, як маці спявала?

— А ты?

Міхась нібы ад болю пакрывіўся:

— І-ых! — выдыхнуў ён. — Каб мне хто зараз заспяваў «Рэчаньку», я расцалаваў бы яго... Які сорам! Не ведаем свайго, наскага...

Мы ўсе, узрушаныя гэтым хвалюючым маналогам, стаялі прысаромленыя, маўклівыя. Вось ён боль, вось ён неспакой паэта. І, мусіць, менавіта ў такія хвіліны і выплаўляюцца ў ягоным сэрцы святыя, трапяткія словы.

У наш аддзел зайшоў незнаёмы хлопец. З выгляду нехлямяжы, у кароткім, паношаным паліто, у вялікіх цёмных акулярах. Было бачна, што не толькі ў мяне, але і ў Гарая хлопец выклікаў непрыемнае ўражанне, амаль раздражненне.

— Вы да каго? — запытаўся ў яго Толя.

— Ды вось вершы прынёс... Мне сказалі зайсці да вас...

І хлопец працягнуў Толю тоўсты замусолены сшытак.

Пачалі чытаць. Цікава. Адзін верш, другі — нова, свежа, паэтычна.

— А вы ў якім класе? — ужо па-іншаму зірнуў на яго Гарай.

— У дзявятым...

— Што ж, для вашага ўзросту няблага. Некаторыя вершы будзем друкаваць.

Абрадаваны хлопец падзякаваў і пайшоў.

А мне стала тужліва. У вершах гэтага нехлямяжага незнаёмца было тое, чаго катастрафічна не хапала мне: начытанасці, высокай культуры думкі, а самае галоўнае — арыгінальнага, паэтычнага бачання навакольнага свету

Надзя сказала нядаўна мне:

— Я дрэнная, вельмі дрэнная... Табе будзе цяжка са мной. Табе патрэбна іншая дзяўчына...

Чаму яна так сказала? Навошта сказала? Не, тут нешта не тое. Нешта з ёю творыцца, нешта ў яе здарылася. А я яшчэ атручваю ёй жыццё сваімі крыўдамі ды прэтэнзіямі.

Надзя прыходзіць у апошнія дні маўклівая, задуменная, сумная. Твар бледны, рэдка калі ажыўляецца ўсмешкай. Вочы нібы тыя азёры позняй дажджлівай восенню.

Чаму аб усім гэтым я падумаў толькі сёння? Дзе быў раней? О, я думаў толькі пра сябе. Занадта многа думаў пра свой настрой, свае пачуцці. А яе душа была для мяне, як суседні лес: усё ніяк не выпадала схадзіць, пацікавіцца.

На жаль, усе мае спробы прабіцца да яе душы, у яе ўнутраны свет, аказаліся марнымі. Яна і блізка не падпускае да таго, што яе хвалюе, засмучае, радуе. На мае далікатныя роспыты, чаму яна такая хмурая, адказвае коратка: «Усё нармальна».

Я ўжо не ведаю, як да яе падступіцца, аб чым гаварыць. Мы сустракаемся амаль кожны вечар, але гэтыя сустрэчы прыносяць мне болей пакут, чым радасці. Напэўна, тое ж адчувае і яна. Мы абое як нацягнутыя струны. Нам, відаць, было б лепей на нейкі час раз’ехацца і супакоіцца, цвяроза ўзважыць, што да чаго, канчаткова рашыць, як жыць далей...

Такая вось атрымалася ў мяне практыка. А якія я звязваў з Брэстам мары, якія песціў надзеі! Усё пайшло шыварат-навыварат і наперакасяк.

Часам, як пры святле маланкі, прыходзіць выразна-халодная думка: усё роўна яна ніколі не будзе маёй. Выйдзе замуж. Скончыць інстытут альбо пераведзецца на завочнае, будзе працаваць у школе, пазнаёміцца з маладым цікавым настаўнікам і выйдзе замуж.

Пра гэта страшна пісаць, балюча думаць. І ў той жа час я пытаюся ў самога сябе: а ты згодзен на тое, каб яна была тваёй жонкай? І не ведаю, што адка-

[illegible]. Баюся. Баюся таго, што цяперашняе трапанне нерваў будзе і пасля. Без [illegible]касці пачуццяў, без духоўнай блізкасці гэта непазбежна.

Але ж і пакінуць яе не магу, не маю сілы. Яна павінна сысці першай...

У Брэст прыехаў Сяргей Смірноў. Той самы пісьменнік, які апошнія гадоў таму настойліва, апантана адшукваў абаронцаў Брэсцкай крэпасці і напісаў пра іх надзвычай эмацыянальную, хвалюючую кнігу. Дзякуючы гэтаму, пра нашу крэпасць загаварылі ва ўсіх кутках Савецкага Саюза. Яна стала ўзорам мужнасці і гераізму. А напярэдадні 20-годдзя Вялікай Перамогі крэпасці надалі званне Героя. Сам жа Сяргей Смірноў за кнігу атрымаў Ленінскую прэмію.

Канешне, прыезд такога шаноўнага пісьменніка стаўся для горада вялікай падзеяй. У крэпасці будуць праведзены грандыёзныя святочныя мерапрыемствы.

А перад гэтым у нас, у рэдакцыі, адбылася адна не дужа прыемная размова. Нейкі незнаёмы мне мужчына (але ў аддзеле ён з усімі на ты) пачаў раптам даводзіць, нібыта ўсё, што зараз адбываецца вакол крэпасці, — гэта прыгожы міф, звычайная ідэалагічная прапаганда. Ніякай ролі ў абароне рубяжоў краіны яна не сыграла. Немцы як ішлі, так і пайшлі. І ўжо на чацвёрты-пяты дзень былі ў Мінску. А тут, у крэпасці, засталося некалькі соцень заложнікаў, якім нічога не заставалася, як трымацца да апошняга патрона. Канешне, іх па-чалавечы шкада, але гэта даволі сумніўны гераізм...

Васіль Аляксандравіч ад такога святатацтва ажно падскочыў са свайго месца.

— А ты, — гнеўна напусціўся ён на мужчыну, — ты чытаў кнігу Смірнова?

— Не чытаў... — сумеўся той. — Але глядзеў некалькі перадач па тэлебачанні.

— Дык пачытай! Тады не будзеш вякаць пра сумніўны гераізм...

Абурацца пачутым сталі і астатнія, хто прысутнічаў у аддзеле. Мужчына, відаць, не чакаў такога дружнага і рэзкага адпору, таму прымірэнча падняў рукі ўгору:

— Ладна, ладна... Наконт абаронцаў я, магчыма, пагарачыўся. Але адкажыце мне тады, чаму тут, у нас, у першыя дні вайны склалася такая катастрафічная сітуацыя? Усім жа было ясна, што вайна вось-вось пачнецца. Чаму ж тады ніхто не паклапаціўся вывезці з крэпасці сем'і ваеннаслужачых? Чаму самалёты на аэрадроме аказаліся незапраўленыя? Чаму не падвезлі боепрыпасы? Дзясяткі «чаму», на якія няма адказу. Як няма і вінаватых...

Трэба было бачыць у гэты момант Васіля Аляксандравіча. Ад абурэння ён ажно не мог падабраць патрэбных слоў:

— Ну, ведаеш! Табе... А ты... Вось як ты загаварыў! Наслухаўся варожых галасоў, і папёрла з цябе антысаветчына. Я цябе лічыў сур'ёзным журналістам, а ты аказаўся з гніллю...

— Ад такога чую! Маёй нагі тут больш не будзе.

Незнаёмец падхапіўся і, ляснуўшы дзвярыма, выскачыў з пакоя.

Пасля гэтага яшчэ некалькі хвілін мы не маглі супакоіцца. Нарэшце загаварылі пра тое, дзеля чаго, уласна кажучы, і сабраліся — як будзем асвятляць святкаванне юбілею? Васіль Аляксандравіч сказаў, што асноўны матэрыял дасць БЕЛТА, а публіцыстыку даручана напісаць яму. Больш нікога з газеты, акрамя галоўнага рэдактара і яго, не запрасілі. Шкада... А мне так хацелася пабыць у крэспасці, пабачыць усё на ўласныя вочы.

У майго Пятра з'явілася сур'ёзная сімпатыя — студэнтка-першакурсніца філалагічнага факультэта Галя. А да гэтай Галі часта прыходзіць яе малодшая сятра Марыйка, якая вучыцца ў педагагічным тэхнікуме.

І вось у гэтую нядзелю мы ўчацвярых — Галя, Марыйка, Пятро і я — пайшлі пагуляць па горадзе. Былі над Мухаўцом, лазілі па крутых насыпах у Брэсцкай крэпасці, ірвалі-ламалі «коцікі», смяяліся, валтузіліся, нібы дзеці. І толькі пад вечар, стомленыя, але задаволеныя, як пісалі раней у раённых газетах, мы вярнуліся дадому.

Пад уражаннем гэтай прагулкі напісаўся верш.

Стрэў дзяўчыну я адну:
Вусны як суніцы.
А ў вочы зазінуў —
Дзве крыніцы...
Думаў, пройдзе ўсё, міне.
Ажно стаў нудзіцца.
Не даюць спакою мне
Дзве крыніцы.

Цяпер мяне цягне пабачыць гэтую дзяўчыну яшчэ. Вечарам ляжу і прыгадваю яе смех, голас, вочы. І на душы робіцца хораша, светла. Цікавая яна дзяўчына, Марыйка. Мне так лёгка, так утульна з ёю. Хоць і былі разам усяго дзень. Ды і то пры сведках.

А што ж Надзя? Надзя застаецца ранейшай. Няўжо яна не разумее, што сваёй маўклівасцю, адчужанасцю не прываблівае мяне, а, наадварот, палохае, адштурхоўвае?

Зацвіла чаромха...

У Брэсце яна ёсць толькі ў адным месцы — у гарадскім парку культуры і адпачынку. І то ўсяго некалькі дрэўцаў. Затое чаромхавы пах адчуваецца амаль у кожным кутку парка. Гэты церпкі, непаўторны пах хмеліць, кружыць галаву, выклікае хвалюючыя эмоцыі ды ўспаміны.

Прыгадваецца, як мы з Надзяй перад маімі школьнымі выпускнымі экзаменамі позним майскім вечарам забрылі ў былы панскі маёнтак, дзе былі цэлыя зарасці здзічэлай чаромхі, якая толькі што зацвіла, і стаяў густы, галавакружны пах. Тады я ўпершыню адважыўся абняць сваю каханую і нясмела, няўмела пацалаваць. Эмоцыі былі такія моцныя, што не толькі закружылася галава, але і захісталася, паплыла пад нагамі зямля... І мы былі тады яшчэ такія юныя: я — у дзясятым, выпускным класе, Надзя — у дзявятым. І здавалася, што наперадзе нас чакае бясконцае і бясхмарнае шчасце.

Зацвіла чаромха.

Першая і самая дакладная прыкмета таго, што прыйшла вясна. Але вось парадокс: разам з чаромхавай квеценню, як правіла, прыходзяць і абавязковыя халады, а часам і замаразкі.

Вось і ў гэтыя дні па нейкіх невытлумачальных прыродных законах тэмпература, што была ўжо ўсталявалася каля дваццаці градусаў, рэзка ўпала. Стала холадна і некамфортна.

Холадна і ў мяне на душы...

Такі ўжо, мусіць, мой лёс: кахаць, гарэць, нудзіцца, пакутаваць і... заставацца ні з чым. Дзяўчаты не любяць такіх, як я — нясмелых, нязграбных, сентыментальных.

Меў рацыю паэт, калі пісаў:

Грубым дается радость,
Нежным — одна печаль...

Учора з Марыйкай быў наш апошні вечар. Паглядзелі ў кінатэатры фільм «Жылі-былі стары са старою», наплакаліся, як бабры. А потым ішлі па прыціхлых вячэрніх вуліцах, ужо аздобленых першай зелянінай, і я чытаў ёй:

Шэпчуцца самотна ясені і клёны,
І маўчаць таполі ў задуменным сне...
Каб ты знала, як балюча сёння
Думаць пра дарогу і пра ростань мне...

Яна з удзячнасцю паглядзела на мяне, і вусны яе кранула мілая, прыемная ўсмешка. І я сам не ведаю, што са мною сталася, пачаў гаварыць, гаварыць:

— Ну вось практыка мая і падышла к канцу. Але сапраўды: мне так не хочацца пакідаць Брэст. Якім ён мне стаў родным, дарагім. А Мінск... Мінск, вядома, цудоўны горад, але ён для мяне без душы. Разумееш, без душы. А тут...

І ўздыхнуў. Яна зноў усміхнулася.

Мы выйшлі да ракі. Заходзіла сонца. Пяшчотна пляскаліся аб бераг хвалі. Недзе на тым беразе крычалі кнігаўкі. Пахла лугам.

Мы прытуліліся плечукамі да шурпатага ствала каштана і ў задуменні маўчалі. Нечакана Марыйка заспявала:

Лён мой, лён...
Ох, тот, кто нравится,
Он не в меня влюблен...

І столькі пачуцця, столькі журботнага болю было ў яе голасе, што ў мяне аж мароз па скуры пайшоў. І я зразумеў: песня гэтая была для мяне, але не пра мяне. Яна спявала пра таго далёкага ветранага Слаўку, які разбудзіў яе харошую, веснавую душу, але не адказаў узаемнасцю. А яна ўсё яшчэ кахала яго...

Назад ішлі моўчкі. Гаварыць не хацелася. Пытацца пра нешта — тактоўна. Навошта — усё зразумела і так.

Надышла хвіліна развітання. Я глядзеў на Марыйку і не мог адарваць ад яе вачэй. Вось яна зараз знікне за паваротам, і можа стацца, што мы ўжо больш ніколі-ніколі не сутрэнемся. Сэрца маё разрывалася ад паўнаты, ад віру, ад блытаніны пачуццяў. Хацелася сказаць, што яна ўжо ўвайшла ў маё жыццё светлай, хвалюючай песняй, што я заўсёды буду памятаць яе. Хацелася дзякаваць за ўсё харошае, чароўнае, што яна прынесла мне з сабою. А я маўчаў...

Толькі калі яна ўжо наважылася ісці, папрасіў:

— Марыйка, скажы мне што-небудзь на развітанне.

Яна памаўчала і задуменна прачытала:

Тонкий явор гнется над осокой,
А осока гнется над водой...

І прыбавіла:

— Добрага спадарожніка табе на дарогу і на жыццё. Да пабачэння!

Я паспеў толькі сказаць:

— Будзь шчаслівай!

З Надзяй атрымалася куды горш.

У суботу зайшоў па яе: хацелася гэтыя апошнія дні пабыць раза пагаварыць, многае сказаць.

Дома яе не заспеў. Я папрасіў дзяўчат, калі яна вернецца, каб зайш ў мой сто чацвёрты пакой.

Праз паўгадзіны прыйшла. Але не адна, а з сяброўкай. І была нейка дзіўная — узбуджаная, усхваляваная. Смех нервовы, ненатуральны. Я н мог даўмецца, што з ёю.

Арганізавалі сціплае застолле. І толькі адкаркавалі пляш шампанскага — як пачуўся стук у дзверы. Заходзіць Аркадзь! Давялос запрасіць за стол і яго.

Ну а далей усё пайшло як звычайна. Надзя ўвесь час з Аркадзе аб нечым сакрэтнічалі, шапталіся. Я займаў свецкай размовай Надзі сяброўку. І толькі адзін раз павярнуўся ў іх бок і ўбачыў, якім пажадным прызыўным позіркам глядзела Надзя на Аркадзя. Востра кальнула думка няўжо яна хоча вярнуць свайго былога прыхільніка? Не можа перанесці што ён ходзіць з іншай дзяўчынай...

І не памыліўся. Калі мы выйшлі на вуліцу, Надзя ўзяла Аркадзя пад руку, і яны пайшлі сваёй дарожкай.

Гневу майму не было межаў! У тыя хвіліны я вырашыў: усё! Не пайду нават развітацца.

І не пайшоў. А сёння вечарам я пакідаю Брэст...

Дачытаўшы апошнюю старонку, Мікола адчуў, што ў вачах стаяць слёзы. Як жа гэтая Надзя падобная на ягоную Віялету! Аказваецца, нічога новага пад сонцам. Усё тыя ж жарсці, сумненні, пакуты...

Мікола інстыктыўна пацягнуўся да мабільніка, каб пазваніць дзеду, распытацца пра ўсё больш падрабязна, але, зірнуўшы на гадзіннік, спыніўся: ішла другая гадзіна ночы. Позна...

З Алесем Пятровічам Мікола сустрэўся толькі назаўтра вечарам, пасля работы.

— Дзядуля, і што было пасля Брэста? — ледзь не з парога пачаў ён роспыты. — Вы больш не сустракаліся?

— А які быў сэнс сустракацца? Хаця я моцна перажываў. Усё раптам страціла сэнс, перамяшаліся дні і ночы. Каб неяк адцягнуць увагу ад гэтых пакут, я пасля летняй сесіі запісаўся у студэнцкі будатрад і паехаў на Урал. А калі праз два месяцы вярнуўся дадому, дазнаўся, што Надзя выйшла замуж за настаўніка з нашай школы, перавялася на завочнае і ўладкавалася на працу ў гэтую ж школу. Я, скончыўшы ўніверсітэт, атрымаў накіраванне ў рэспубліканскую газету, застаўся ў Мінску.

— І што, пасля гэтага вы сапраўды больш не бачыліся?

— Ну чаму ж? Недзе гады праз тры мы сустрэліся ў Пінску, куды Надзя з мужам пераехала на жыхарства, і прагаварылі амаль паўдня. Але

Наша гэта была нудная, цягуча-пакутлівая гаворка. І тады я канчаткова пераканаўся, што мы разышліся не выпадкова. Яна не была маім лёсам, хутчэй, як кажуць, палавінкай.

— Дзядуля, а як жа дазнацца, што гэта твая палавінка?

— Вельмі проста. Гэта калі табе з тваёй дзяўчынай лёгка і проста, калі ты не можаш з ёю нагаварыцца, калі кожная сустрэча з ёю — радасць, калі ты не можаш дачакацца новай сустрэчы. Помніш, як у Пушкіна: «Я утром должен быть уверен, что с вами днем увижусь я»? Вось калі ўсё гэта ёсць, то тады ўсё нармальна. Значыць, яна — твая палавінка.

Мікола сядзеў у задуменні. Маўчаў і Алесь Пятровіч: ён выдатна разумеў, што зараз творыцца ў душы ўнука.